Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!
Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

43 (7369) | Нядзеля, 4 сакавіка 1945 г. | Цана 20 кап.

Войскі 2-га Беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне, з боем авалодалі гарадамі Румельсбург і Полноў—важнымі вузламі камунікацый і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў у Памераніі.

Слава нашай герайчнай Чырвонай Арміі!

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 2-га Беларускага фронта
Маршалу Совецкага Саюза РАКАСОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-палкоўніку БАГАЛЮБАВУ

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, сёння, 3 сакавіка, з боем авалодалі гарадамі РУМЕЛЬСБУРГ і ПОЛНОЎ—важнымі вузламі камунікацый і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў у Памераніі.

У баях за аваладанне гарадамі РУМЕЛЬСБУРГ і ПОЛНОЎ вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ТРУБНІКАВА, генерал-палкоўніка ПАПОВА, генерал-лейтэнанта ЛЯПІНА, генерал-лейтэнанта ДРАТВІНА, генерал-маёра СКОРАБАГАТКІНА, генерал-маёра ХУДАЛАВА, палкоўніка ГРЭБЕНКІНА, палкоўніка ХРАМЦОВА, падпалкоўніка БАЦЫЕНКА, палкоўніка РОГАВА, палкоўніка МЕШКОВА, генерал-маёра ГУСЕВА, генерал-маёра БЕЛАСКУРСКАГА, палкоўніка МУРАТАВА; артылерысты генерал-палкоўніка артылерыі САКОЛЬСКАГА, генерал-маёра артылерыі БЕЗРУК, генерал-маёра артылерыі ЛІХАЧОВА, палкоўніка КУЛІЧУК, палкоўніка ВОЛКАВА, палкоўніка НЕСВЕТАЙЛО, палкоўніка ГЕРАСІМЕНКА, палкоўніка КІРГЕТАВА, маёра БАЙЕУЗЕНКА; танкісты генерал-лейтэнанта танкавых войск ЧЭРНЯЎСКАГА, генерал-лейтэнанта танкавых войск ПАНФІЛАВА, палкоўніка УРВАНАВА, падпалкоўніка ЕГОРАВА, падпалкоўніка КУЦ, падпалкоўніка РАЗАНЦАВА, падпалкоўніка ОРОЛ, падпалкоўніка НЕМКОВІЧА, палкоўніка ХАРЫТОНАВА, маёра ПАТАПАВА, падпалкоўніка БАЛЫКОВА, лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі ВЕРШЫНІНА, генерал-маёра авіяцыі Алексеева, генерал-лейтэнанта авіяцыі БАЙДУКОВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі АСІПЕНКА, палкоўніка ГРЫШЧЭНКА, палкоўніка ВІНАГРАДАВА, палкоўніка РЫБАКОВА, палкоўніка КАЛУГІНА, палкоўніка СМАЛОВІКА, палкоўніка ВУСС; сапёры палкоўніка КЛЕМЕНЦЬЕВА, інжынер-палкоўніка ПАЛАЎНЁВА; сувязісты палкоўніка СЫЧОВА, маёра ГРАДЗЕЦКАГА, падпалкоўніка ЛЕБЕДЗЕВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за аваладанне гарадамі РУМЕЛЬСБУРГ і ПОЛНОЎ, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 3 сакавіка, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га Беларускага фронта, якія авалодалі названымі гарадамі,—дванаццаццю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за аваладанне гарадамі РУМЕЛЬСБУРГ і ПОЛНОЎ.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза **І. СТАЛІН.**

3 сакавіка 1945 года.
№ 287

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 3 САКАВІКА

Войскі 2-га БЕЛАРУСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, 3 сакавіка з боем авалодалі гарадамі РУМЕЛЬСБУРГ і ПОЛНОЎ—важнымі вузламі камунікацый і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў у Памераніі, а таксама з баямі занялі больш 80 другіх населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты ГРОС ПЕТЭРКАУ, ШТАРЗЕН, ГРОС ШВІРЗЕН, КУРАЎ, ДАРГЕН.

На тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўночным захадзе і захадзе ад горада ЛУЧАНЕЦ, нашы войскі з баямі занялі населеныя пункты ОЧОВА, КАЛІНКА, КРАЛЕЎЦЭ, ПРЭНЧОЎ, БЕЛУЙ, ПОЧУВАДЛО, УГЛІСКА, БРЭГІ.

На другіх участках фронта—баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 2 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 39 нямецкіх танкаў.

* * *

Войскі 2-га Беларускага фронта прадаўжалі наступленне. Праціўнік, імкнучыся затрымаць прасоўванне совецкіх часцей, кідае ў бой рэзервы. Адзначана паяўленне свежых эсэсаўскіх злучэнняў, танкавых часцей і падраздзяленняў самаходнай артылерыі. Палонныя паведамляюць, што нямецкае камандаванне аддала сваім войскам загад любой цаной не дапусціць выхаду совецкіх войск да Балтыйскага мора. Жорсткія баі адбываліся сёння на подступах да горада Румельсбург. Немцы сканцэнтравалі тут буйныя сілы і прадпрынялі контратаку ў заходнім напрамку. Яны разлічвалі адным ударам адкінуць нашы войскі і прарвацца на камунікацыі совецкіх часцей, якія пагражаюць гораду Кезлін. Аднак гэты замысел гітлераўцаў быў сарван. Совецкія артылерысты і пехацінцы адбілі варожую контратаку. Затым нашы войскі нанеслі праціўніку імклівы ўдар і пасля ўпорнага бою авалодалі горадам Румельсбург. Гэты горад з'яўляўся вельмі ўмацаваным пунктам абароны немцаў у Памераніі і важным вузлом камунікацый. Да яго зыходзяцца тры чыгункі і некалькі шасейных дарог. Развіваючы поспех, нашы войскі прасунуліся ўперад на 15 кілометраў і штурмам занялі горад Полноў. У ходзе баёў праціўнік нясе вялікія страты. За дзень знішчана звыш 2000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Падбіта і спалена 20 танкаў праціўніка. Захоплена многа трафеяў і палонныя.

* * *

У Брэслау нашы войскі прадаўжалі весці баі па ліквідацыі акружанай у горадзе групіроўкі праціўніка. Нашы штурмавыя групы ачысцілі ад немцаў раён Крэматорыя, на паўднёва-заходняй ускраіне горада. На месцы бою асталіся сотні варожых трупаў. Узята ў палон 200 гітлераўцаў.

* * *

На паўночным захадзе ад горада Лучанец нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад. Праціўнік, апіраючыся на абарончыя рубяжы, збудаваныя ў горна-лясістай мясцовасці, аказваў упорнае супраціўленне. Совецкія часці робяць абходныя манеўры і ўдарамі з тыла і флангаў ліквідуюць варожыя апорныя пункты. Падраздзяленні Н-скай часці выбілі гітлераўцаў з вельмі ўмацаванага населенага пункта Прэнчоў і вядуць баі за гару Сітна. На працягу дня на гэтым участку знішчана да батальёна варожай пяхоты. Захоплены ў немцаў артылерыйская батарэя, 29 кулямётаў і іншыя трафеі.

* * *

Караблямі Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота патоплен у паўднёвай частцы Балтыйскага мора нямецкі транспарт водазмяшчэннем у 6 тысяч тон.

* * *

Узяты ў палон камандзір 304 нямецкай пяхотнай дывізіі генерал-маёр Ульрых Ліс доўгі час працаваў у 3-м аддзеле нямецкага генеральнага штаба (аддзел заходніх армій). У студзені 1945 года Ліс быў назначан камандзірам дывізіі і накіраван на совецка-германскі фронт. Палонны расказаў: «Германскае камандаванне з дня на дзень чакала зімовага наступлення рускіх. У вышэйшых ваенных колах панавала ўпэўненасць, што нямецкай арміі ўдасца ўтрымацца на абарончых рубяжах на Віслe. Праз некалькі дзён пасля пачатку рускага наступлення ад гэтай упэўненасці і следу не асталося. Раней чым генеральны штаб паспеў прыняць якія-небудзь меры, рускія на велізарным фронце змялі і сакрушылі нямецкую абарону. Нямецкае камандаванне загадала прыпыніць усе наступальныя аперацыі на Заходнім фронце і перайсці там да абароны. Пачалася спешная перакідка войск з Заходняга фронта на Усходні. Аднак ужо было позна».

Палонны камандзір 433 нямецкай пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнант Любе паведаміў: «За чатыры дні мая дывізія была разбіта і перастала існаваць як баявая адзінка. Яшчэ задоўга да студзеньскага наступлення рускіх я вельмі песімістычна ацэньваў становішча нямецкай арміі. Довады розуму гаварылі за тое, што ў Германіі ўжо няма ніякіх шансаў на перамогу. І ўсё-ж надзвычай хуткі разгром нямецкай абароны з'явіўся для мяне поўнай нечаканасцю. Я не допускаў думкі, што прасоўванне рускіх будзе такім імклівым і глыбокім».

Баявымі справамі адказвае беларускі народ на загад правадыра

Дзесяць дзён таму назад народы нашай неабсяжнай краіны адзначалі 27-ю гадавіну Чырвонай Арміі. У дзень свята Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталін выдаў загад, які ўзброіў нашу армію і народ праграмай барацьбы і працы. Вялікі правадыр у сваім загадзе да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі адзначыў гістарычныя поспехі ўзброеных сіл совецкай дзяржавы, даў малюнак грандыёзнага наступлення Чырвонай Арміі ў апошнія месяцы, якое набліжае дзень канчатковай перамогі над ворагам. Адначасова ў сваім загадзе таварыш Сталін паставіў задачы перад арміяй і народам, выкананне якіх прывядзе да поўнага крушэння гітлераўскай Германіі, да хуткай і канчатковай перамогі нашай справядлівай справы.

«Поўная перамога над немцамі цяпер ужо блізка. Але перамога ніколі не прыходзіць сама,—яна здабываецца ў цяжкіх баях і ва ўпорнай працы. Асуджаны вораг кідае ў бой апошнія сілы, адчайна супраціўляецца, каб пазбегнуць суровай адплаты. Ён хапаецца і будзе хапацца за самыя крайнія і подлыя сродкі барацьбы. Таму трэба памятаць, што чым бліжэй наша перамога, тым вышэй павінна быць наша пільнасць, тым мацней павінны быць нашы ўдары па ворагу». (Сталін).

Гэтыя задачы Чырвоная Армія і совецкі народ успрынялі як баявую праграму сваёй барацьбы, сваёй дзейнасці і паводзін.

Чырвоная Армія адказвае на загад свайго палкаводца новымі баявымі подвігамі, якія залатымі старонкамі ўваходзяць у летапіс Айчыннай вайны. Ламаючы шалёнае супраціўленне ворага, сакрушаючы на сваім шляху яго бастыёны і крэпасці, армія-помстніца, армія-вызваліцельніца ідзе ўперад і граміць ворага ў яго ўласнай бярлозе. З радасцю ўспрымае наш народ кожную вестку пра далейшае прасоўванне нашых войск уперад, пра аваладанне новымі і новымі ўмацаванымі пунктамі ворага.

Працаўнікі тыла адказваюць на загад свайго правадыра новым працоўным гераізмам, плады якога—дадатковае ўзбраенне для арміі, дадатковая прадукцыя фронту і краіне, прадукцыя для хутчэйшага аднаўлення разбуранай ворагам народнай гаспадаркі.

З неперадаваемым уздымам сустрэў загад таварыша Сталіна беларускі народ. Па ўсёй рэспубліцы пракацілася хваля мітынгаў і сходаў, на якіх выступалі сотні і тысячы прамоўцаў—рабочыя, калгаснікі, інтэлігенты. У адзін голас гаварылі яны аб радасці нашых перамог, аб сваёй рашымасці ўсе сілы аддаць на свяшчэнную справу разгрому нямецкіх катаў. І гэта былі не простыя словы. Гэта была клятва народа. Рабочыя калектывы, цэхі, агрэгаты, члены сельскагаспадарчых арцелей, служачыя совецкіх устаноў бралі на сябе новыя павышаныя абавязацельствы.

Слова совецкага чалавека — цвёрдае слова. І пасля таго, як абавязацельствы былі ўзяты, пачалася барацьба за іх выкананне і перавыкананне.

З усіх канцоў Совецкай Беларусі штодзённа паступаюць весткі пра той творчы ўздым, які ахапіў працаўнікоў совецкага тыла.

Як паведамляюць нам з Гродна, у адказ на загад таварыша Сталіна рабочыя мясакамбіната датэрмінова закончылі аднаўленне новага цэха і цэха па выпуску медыцынскіх прэпаратаў.

Новым павышэннем прадукцыйнасці працы адказалі на загад правадыра лесарубы і возчыкі, што працуюць у беларускіх лясах. Лесарубы і возчыкі Яглевіцкага сельсовета, Косаўскага раёна, перавыканалі квартальны план па нарыхтоўцы і вывазцы лесу на 30 працантаў. На рабоце вызначыліся дзесяткі людзей, якія прадаўжаюць з дня ў дзень павышаць прадукцыйнасць працы.

Новымі працоўнымі подвігамі адгукнуліся на загад калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі рэспублікі. Сяляне Аюцэвіцкага сельсовета, Мірскага раёна, у адказ на загад правадыра на працягу двух дзён выканалі квартальны план мясанарыхтовак, а некаторыя сяляне разлічыліся з дзяржавай па нарыхтоўках мяса за ўвесь 1945 год.

Пра новыя факты паспяховай работы ў адказ на загад таварыша Сталіна паведамляецца ў сённяшнім нумары нашай газеты. Гэтых фактаў—безліч. Кожны з іх і ўсе яны разам—сведчанне таго творчага парыву, якім ахоплен наш народ у гэтыя дні. Абавязак партыйных, совецкіх і гаспадарчых арганізацый заключаецца ў тым, каб узначаліць гэты творчы парыў мас і накіраваць яго на рашэнне баявых і важнейшых задач дня.

А задачы гэтыя—шматгранныя і адказныя. У найкарацейшы тэрмін мы павінны аднавіць гаспадарку рэспублікі, па-зверску разбураную нямецкімі захопнікамі.

Непачаты край работы па аднаўленню нашай прамысловасці. Прадстаіць зрабіць многае. Аднак, як паказалі рэспубліканскія нарады работнікаў мясцовай і лёгкай прамысловасці, магчымасці для хутчэйшага аднаўлення заводаў і фабрык і для ўзорнай арганізацыі іх работы выкарыстоўваюцца не заўсёды і не ўсюды. Асабліва дрэнна працуе такая важнейшая галіна народнай гаспадаркі, як лёгкая прамысловасць, не скарыстоўвае яшчэ ўсіх унутраных магчымасцей мясцовая прамысловасць. Рэзкага павелічэння прадукцыі павінны дасягнуць энергетычная гаспадарка, паліўная, лесахімічная прамысловасць і г. д.

Мабілізацыя рабочых калектываў на павышэнне тэмпаў і якасці аднаўленчых работ, на павышэнне прадукцыйнасці працы, на рашучае павелічэнне выпуску і палепшанне якасці прадукцыі — вось што павінна стаць прадметам штодзённых і штогадзінных клопатаў работнікаў нашай прамысловасці, партыйных і совецкіх арганізацый, наркаматаў.

Адказнейшыя задачы стаяць перад калгаснікамі ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, перад працоўнымі аднаасобнікамі рэспублікі. Узорнай падрыхтоўкай да сяўбы і правядзеннем далейшых работ мы павінны забяспечыць у гэтым годзе высокі ўраджай на вызваленай зямлі.

У рашэнні гэтай задачы найвялікшую ролю павінны адыграць нашы машынна-трактарныя станцыі. Калектыў работнікаў Прапойскай МТС выступіў з прапановай арганізаваць усебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва за ўзорную работу МТС у 1945 годзе, абавязаўшыся пры гэтым датэрмінова і добраякасна адрамантаваць трактары і прычэпны сельскагаспадарчы інвентар, выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар 1500 гектараў, зэканоміць гаручага 15 працантаў і змазачных—7 працантаў. На заклік прапойскіх трактарыстаў ва усебеларускае спаборніцтва адна за другой уступаюць машынна-трактарныя станцыі рэспублікі, бяручы сабе за ўзор абавязацельствы ініцыятараў спаборніцтва. Задача заключаецца ў тым, каб гэтае спаборніцтва па-дзеlавому і настойліва разгортваць.

Загад таварыша Сталіна да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі ўзброіў наш народ баявой праграмай дзеяння. Аддадзім-жа ўсе нашы сілы на выкананне гэтай праграмы, на свяшчэнную справу поўнага і канчатковага разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў!

Уручэнне ордэнаў „Маці-гераіня" многадзетным маці рам

Гэтымі днямі намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Н. Я. Наталевіч уручыў ордэны «Маці-гераіня» і граматы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР групе ўзнагароджаных многадзетных мацярэй Беларусі.

Ордэн «Маці-гераіня» і грамату Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР атрымала калгасніца Сарокіна М. П. з сельгасарцелі «Профінтэрн», Рудакоўскага сельсовета, Віцебскага раёна, якая выхавала 10 дзяцей. 6 з іх—воіны Чырвонай Арміі. У баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі яны праяўляюць мужнасць і гераізм. Яны з'яўляюцца вернымі абаронцамі нашай слаўнай Радзімы.

Ордэн «Маці-гераіня» ўручан калгасніцы Сляпцовай К. М. з вёскі Новая Ганчарка, Расасненскага сельсовета, Дубровенскага раёна, Віцебскай вобласці, якая нарадзіла і выхавала 12 дзяцей.

У ліку ўзнагароджаных—хатняя гаспадыня Гаўрылік С. І. з вёскі Вялікая Капліца, Путрышкоўскага сельсовета, Гродненскага раёна, калгасніца Штацкая Д. Р. з сельгасарцелі «Росквіт», Дудзіцкага сельсовета, Чачэрскага раёна, Струкава Е. І. з калгаса «Пралетарый», Новамалыніцкага сельсовета, Чачэрскага раёна, якая выхавала 11 дзяцей. У гэтым годзе тав. Струкава выпрацавала ў калгасе 200 працадзён.

Ордэны «Маці-гераіня» атрымалі таксама калгасніца Суша З. Ф. з сельгасарцелі «Вішанка», Грэбенкоўскага сельсовета, Чэрвеньскага раёна, Раеўская С. І. з вёскі Падсоцкія, Стальбоўшчынскага сельсовета, Уздзенскага раёна, Целінкевіч М. Ф., сялянка вёскі Малькі, Чэрненскага сельсовета, Брэсцкага раёна.

Узнагароджаная ордэнам «Маці-гераіня» калгасніца сельгасарцелі імені Будзённага Данілавіцкага сельсовета, Веткаўскага раёна М. І. Свабодчыкава расказала аб тым, як нямецкія бандыты разграбілі яе маёмасць—забралі карову, свіней, пакінулі ўсю сям'ю без сродкаў да існавання.—Зараз,—гаворыць яна,—я, як усе гераіні-маці, атрымала вопратку для сябе і дзяцей—паліто, абутак, сукенкі, бялізну і г. д. Усе мае дзеці навучаюцца ў школе. Я ўдзячна нашаму ўраду за ўвагу і клопаты.

Пасля ўручэння ўзнагарод тав. Наталевіч сардэчна віншаваў узнагароджаных.

(БЕЛТА).

Новыя поспехі чыгуначнікаў

ГОМЕЛЬ, 3 сакавіка. (БЕЛТА). У адказ на загад таварыша Сталіна работнікі Беларускай чыгункі імкнуцца новымі вытворчымі поспехамі дапамагчы Чырвонай Арміі дабіцца хутчэйшай перамогі над ворагам. Паравознікі дэпо Магілёў адказалі на загад правадыра стварэннем лунінскай калоны паравозаў. У яе ўвайшлі лепшыя машыністы дэпо тт. Падашэўка, Качмароў і другія. Яны водзяць паязды на высокіх скарасцях, дабіваюцца значнай эканоміі паліва. Гэтая калона папаўняецца новымі машыністамі, якія за апошні час дабіліся значных поспехаў у рабоце. У дэпо Шчорс па такому-ж прынцыпу арганізавана калона паравозаў «Перамога». У яе увайшлі лепшыя машыністы—тт. Варабей, Дарашэнка і другія. Машыніст Гомельскага дэпо тав. Жалезнякоў гэтымі днямі правёў воінскі поезд з перавыкананнем нормы тэхнічнай хуткасці на 12 кіламетраў.

Ад паравознікаў не адстаюць чыгуначнікі і іншых служб. Змена манеўравага дыспетчара станцыі Жлобін тав. Кашалёва пасля загада таварыша Сталіна ўвяла большую чоткасць ў скарасной апрацоўцы паяздоў і штодзённа дабіваецца скарачэння прастою сотняў вагонаў. Калектыў Унечскага вагона-рамонтнага пункта лютаўскі план рамонту выканаў са значным перавышэннем і зараз сутачныя заданні выконвае на 150 працантаў.

ШКЛОЗАВОД УСТУПАЕ Ў СТРОЙ

ГРОДНА. (Кар. «Звязды»). Заканчваюцца апошнія падрыхтоўчыя работы да пуску Гродненскага шклозавода. У механічнай майстэрні ярка палае горн. Тут вырабляюцца формы для адліўкі пасуды.

Побач з механічнай майстэрняй—ганчарны цэх. Тут ужо вырабляюць агнетрывалую цэглу, якая ідзе для будаўніцтва ванных печаў. У далейшым гэты цэх будзе вырабляць гліняныя трубы. Заканчваюцца будаўнічыя работы ў сартыровачным цэху.

— Асноўнае ўжо зроблена. Ванная печ пабудавана і можа даваць прадукцыю,—гаворыць дырэктар завода тав. Лянчэўскі,—а тая цэгла, якую мы вырабляем цяпер, будзе патрэбна для перыядычнага рамонту ванных печаў.

Гродненскі шклозавод нямецкімі бандытамі быў спален. Асталіся толькі адны сцены. Дзякуючы самаадданай рабоце калектыва рабочых зараз ён зноў становіцца ў строй дзеючых. У другой палавіне сакавіка месяца яго прадукцыя—шкляная пасуда і аконнае шкло—пачне паступаць у гарады і вёскі нашай рэспублікі. Выпуск аконнага шкла — для завода справа новая. Да вайны ён не вырабляў гэтай прадукцыі, а цяпер яна будзе асвоена.

АБЛАСНАЯ НАРАДА КІРАЎНІКОЎ АГІТКАЛЕКТЫВАЎ

БАБРУЙСК, 3 сакавіка. (БЕЛТА). Адбылася абласная нарада кіраўнікоў агіткалектываў. З дакладам аб выкананні пастановы ЦК ВКП(б) аб масава-палітычнай і культурна-асветнай рабоце сярод насельніцтва выступіў нам. загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі абкома КП(б)Б тав. Пероўскі.

З дня вызвалення ад нямецкіх захопнікаў агітатары і прапагандысты вобласці правялі вялікую работу. Зараз у раёнах створана 238 агіткалектываў. Яны аб'ядноўваюць 3.807 агітатараў. Аднак палітыка-масавая работа ў вобласці яшчэ не зусім добра наладжана. Агітатары, праводзячы гутаркі, часта не звязваюць іх з неадкладнымі задачамі сваіх калгасаў і прадпрыемстваў.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Змястоўным было выступленне кіраўніка агіткалектыва Жыпінскага сельсовета, Старадарожскага раёна, тав. Лабаня. У састаў калектыва, якім ён кіруе, уваходзіць 28 агітатараў. Усе агітатары ў калгасах замацаваны за брыгадамі і звеннямі. Два разы ў месяц тут праводзяцца семінары. Практыкуюцца таксама нарады па абмену вопытам работы агітатараў. У выніку добра пастаўленай палітыка-масавай работы сельсовет стаў перадавым у вобласці. Усе калгасы гэтага сельсовета поўнасцю засыпалі і ачысцілі насенне. Закончылі рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Перавыканан таксама план першага квартала па нарыхтоўцы і вывазцы драўніны.

◆

Выканалі квартальны вытворчы план

ПІНСК, 3 сакавіка. (БЕЛТА). Адказваючы на загад таварыша Сталіна, калектыў Нагішанскага ваннавага завода датэрмінова выканаў план першага квартала 1945 года.

Рабочыя, не зніжаючы прадукцыйнасці працы, даюць прадукцыю звыш квартальнай праграмы.

◆

СПАБОРНІЦТВА ЗА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА СЯЎБЫ

ГРЭСК, 3 сакавіка (БЕЛТА). У раёне ўсё шырэй разгортваецца спаборніцтва калгасаў, брыгад і звенняў за лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы і вырошчванне высокіх ураджаяў. Узорна рыхтуюцца да вясны калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Чапаева. Яны поўнасцю засыпалі насенне, адрамантавалі сельскагаспадарчы інвентар, арганізавалі месячнік па нарыхтоўцы ўгнаення і вывазцы яго на палі. У бліжэйшыя дні брыгады і звенні зробяць пробны выезд у поле.

Уперадзе ідуць калгасы Мусіцкага і Гацукоўскага сельсоветаў. Тут арганізаваны звенні высокага ўраджаю, поўнасцю закончан рамонт сельскагаспадарчага інвентару і ачыстка насення.



Другі Беларускі фронт.
Ва Усходняй Прусіі. Ваенная тэхніка, пакінутая немцамі на дарогах адступлення.
Фото Э. Еўзерыхіна (Фотахроніка ТАСС).

У ЗАМКУ „ФАЛЬКЕНХОРСТ“

Старадаўні замак «Фалькенхорст» гвардзейцы падпалкоўніка Петрова ўзялі вечарам без адзінага выстралу.

У замку не было ні душы, але ўсё-ж здавалася, што ў ім жывуць людзі. Ва ўсіх залах гарэла электрычнае святло, прыглушанае цёмнымі калпакамі абажураў. Жыхары замка выбраліся адсюль, спяшаючыся. У адным з залаў стаяла многа вялікіх часткова ўжо ўпакаваных чэмаданаў. На падлозе і сталах валяліся футляры з-пад сталовага срэбра і каштоўнасцей.

Уладар замка адстаўны маёр фон Штаме захапляўся паляваннем. Сцены вялікага прыёмнага зала і кабінета маёра ўвешаны паляўнічымі трафеямі. Працавалі-ж на немцаў дзесяткі рускіх, якія знаходзіліся дзесьці на задворках замка.

Але не толькі на паднявольнай працы расло багацце фон Штаме. Сын адстаўнога маёра Эрых, капітан германскага паветранага флота, прывозіў у бацькоўскі замак дабро з усіх канцоў Еўропы. Мы знаходзім у замку французскі фарфар і бельгійскія карункі, мэблю польскіх князёў і дываны, вывезеныя з Расіі, італьянскую вазу і нарвежскія лыжы. У адным з пакояў вісіць карціна совецкага мастака Герасімава, украдзеная, мяркуючы па штампу на звароце палатна, у горадзе Пушкіне. Нават сталовая бялізна ў замку аказалася з манаграмамі, якія не маюць нічога агульнага з ініцыяламі членаў сям'і фон Штаме. Замак «Фалькенхорст» быў, папросту гаворачы, зладзейскай «малінай», куды сцякалася награбленае.

У бібліятэцы замка мы знайшлі цэлую груду сямейных альбомаў. Вось самы стары альбом у пераплёце з пацёртага саф'яна. Пажаўцеўшыя фатаграфіі дзядоў, а магчыма і прадзедаў. І яны былі ваеннымі. Доўгаполыя мундзіры, ківеры з султанамі, ганарыстыя вусатыя фізіяноміі. А вось альбомы часоў мінулай сусветнай вайны. Сотні фатаграфій уладара замка, цяпер маёра ў адстаўцы. Маёр ля артылерыйскай батарэі. Маёр ля загароды, за якой відаць рускія ваеннапалонныя. Маёр побач са сваёй палаткай. Вёска дзесьці на Валыні, якая гарыць. Трыццаць год назад з рускімі ваяваў фон Штаме-бацька. У 1941 годзе фон Штаме-сын быў у ліку тых, хто скінуў першыя бомбы на Брэст і Кіеў.

Ёсць у бібліятэцы і асобны альбом, які так і астаўся да канца незапоўненым, альбом, прысвечаны апошняму одпрыску ваяўнічай нямецкай фаміліі.

Вузкі лоб, доўгі прыплюснуты нос, ганарыста выпучаная ніжняя губа—такі партрэт Эрыха фон Штаме. Эрых любіў пазіраваць. Ён здымаўся і ў кабіне свайго бамбардыроўшчыка, і на пасадачнай пляцоўцы каля самалётаў, і ў крузе прыяцеляў, і з якімісьці вясёлымі дзяўчатамі, і з бутэлькай рому, запракінутай у рот.

Мяркуючы па здымках, Эрых фон Штаме, не гледзячы на даволі скромны чын, быў не простым афіцэрам, а важнай птушкай. На адным са здымкаў мы бачым яго, размаўляючым з рэйхсмаршалам Герынгам. Другая фатаграфія паказвае капітана фон Штаме, які знаходзіцца ў саставе якойсьці дэпутацыі на прыёме ў Гітлера, Гебельса і Розенберга.

Адкуль такая ўвага фашысцкіх главароў да скромнага капітана паветранага флота? Адказ можа быць толькі адзін. Капітан фон Штаме належаў да старадаўняй нямецкай ваеннай фаміліі, якая заўсёды дапамагала ажыццяўляць захопніцкія імкненні Германіі, да аднаго з сем'яў, на якія апіраліся Гітлер і яго падручныя. Замак фон Штаме посіць назву «Фалькенхорст», што ў перакладзе азначае «Сакалінае гняздо». Але не сакаліным, а асіным гняздом з'яўляўся гэты старадаўні замак.

Гвардзейцы прабылі ў замку «Фалькенхорст» зусім нядоўга. З ранейшай імклівасцю яны рушылі ўперад. Вораг не ўцячэ, вораг будзе насцігнуты! Не выкруціцца, не схавацца нідзе ад адплаты ні паветранаму пірату Эрыху фон Штаме, ні яго бацьку, што ў страху аглядаецца зараз назад, сціскаючы ў дрыжачых руках саквояж з крадзенымі каштоўнасцямі.

Еўгеній ШАТРОЎ.

2-гі Беларускі фронт,
2 сакавіка.
(Спец. кар. ТАСС).

Пісьмо з фронта

Добры дзень, дарагія землякі!

Пішу вам гэтыя радкі з Усходняй Прусіі. Я хачу падзяліцца з вамі той радасцю, якая ахапіла мяне і ўсіх маіх братоў па зброі. Сёння на пярэднім краі мы прагледзелі фільм «Жыві, родная Беларусь!» Для нас гэта было вялікай урачыстасцю і радасцю: тут, на фронце, дзе мы дабіваем немцаў, у невялікім ляску мы слухалі чароўную беларускую музыку.

Калі я глядзеў гэты хвалюючы фільм, усе мае думкі і гарачыя парывы юнацкага сэрца былі накіраваны да цябе, беларуская зямля, да цябе, беларускі народ. Усіх нас захапляла цудоўная ігра беларускіх артыстаў, якія ўславілі ў песнях гераічную барацьбу беларускага народа.

Ад усяго салдацкага сэрца хочацца падзякаваць артыстаў Александроўскую, Млодэк, Балоціна і другіх за выдатнае выкананне беларускіх народных песень, і ўвесь калектыў, які працаваў над фільмам.

Сёння мы ідзем у бой з праклятай немчурой, якая хацела ўдушыць цябе, Беларусь. Мы ідзем у бой за тваё шчасце і росквіт, беларуская зямля.

Дык жыві-ж, родная Беларусь! Мы, воіны-беларусы, разам з сынамі другіх совецкіх народаў абаранілі цябе ад лютых ворагаў.

Лейтэнант Іван **АБАБУРКА.**

Палявая пошта 37341.

◆

МІНЕРАЛЬНЫЯ ЎГНАЕННІ ДЛЯ КАЛГАСАЎ РЭСПУБЛІКІ

Наркамзем Саюза ССР адпусціў калгасам рэспублікі ў лік першага квартала 1945 года 6 тысяч тон мінеральных угнаенняў—фосфарнай мукі і хлорыстага калія, якія будуць выкарыстаны ў асноўным пад гатунковыя пасевы бульбы, ільну і пшаніцы.

Для барацьбы з хваробамі сельскагаспадарчых культур завезен таксама фармалін і прэпарат Давыдава.

Калгасы прыступілі ўжо да вывазкі мінеральных угнаенняў.

(БЕЛТА).

АДНОЎЛЕНЫ ВЕТЭРЫНАРНЫЯ ЛЯЧЭБНЫЯ ЎСТАНОВЫ

БАБРУЙСК, 2 сакавіка. (БЕЛТА). Нямецка-фашысцкія акупанты знішчылі ўсе ветэрынарныя ўстановы вобласці. З дня вызвалення праведзена вялікая работа па іх аднаўленню. У раёнах вобласці зараз створана 56 ветэрынарных пунктаў, 20 ветэрынарна-урачэбных участкаў, 14 раённых ветлячэбніц. У 80 калгасах вобласці абсталяваны газакамеры.

БРАТЫ КУЛЯМЁТЧЫКІ

Я хачу расказаць аб адным з герояў нашага наступлення.

Нашаму падраздзяленню, пасля паспяховага фарсіравання воднага рубяжа, было загадана выбіць немцаў з пануючай вышыні. Навокал яе праціўнік пабудаваў разгалінаваную сістэму траншэй, многа дотаў і дзотаў. Перад вышыняй у некалькі радоў праходзілі дротавыя загароды. Немцы лічылі гэту вышыню, што прыкрывала подступы да важных камунікацый, непрыступнай.

І вось у вызначаны час пачаўся штурм вышыні. Нашы артылерысты абрушылі на яе ўсю магутнасць свайго агню, пачала прасоўванне ўперад наша пяхота. Калі пехацінцы былі ўжо каля дротавых загарод, па іх нечакана адкрылі агонь варожыя кулямёты.

У гэтую крытычную хвіліну каля самых загарод запрацаваў наш «Максім». Гэта білі браты Пётр і Ілья Ліпай. Аказваецца, што яны ішлі ў першых радах штурмуючых, падышлі да варожай абароны і ўстанавілі свой кулямёт. Побач з імі залёг аўтаматчык Гаўрыленка.

Нашы байцы зноў пайшлі ўперад. Падняліся і кінуліся ўперад разам з пехацінцамі аўтаматчык Гаўрыленка і кулямётчык Ілья. Апошні крыкнуў свайму першаму нумару—Пятру:

— Возьмем траншэі, я прыбягу за табой.

Герасіменка і Ілья Ліпай першымі перадолелі дротавыя загароды і ўварваліся ў варожыя траншэі. У рукапашнай схватцы гранатамі і штыкамі яны знішчылі 13 гітлераўцаў, а траіх захапілі ў палон. Парадкам папрацавалі і астатнія нашы байцы.

У хуткім часе траншэя была занята. Ілья ўспомніў пра свайго брата і пабег да яго. Яны сустрэліся каля траншэі: Пётр цягнуў «Максіма», несучы набітыя патронамі ленты. Удваіх браты хутка дагналі пехацінцаў, якія падыходзілі ўжо да населенага пункта. Тут зноў нашым байцам перагарадзілі дарогу варожыя кулямётчыкі. Стралялі яны з першай будыніны, што стаяла каля дарогі. Пётр распарадзіўся:

— Давай, брат, угамонім і гэтых фрыцаў.

Аднак агонь ліпаеўскага кулямёта не меў поспеху. У гэты час на нашых кулямётчыках ударыў варожы мінамёт. Пётр быў ранен, але не пакінуў поля бою.

— Пэм, Ілья,—сказаў ён брату,—нельга цяпер ісці з поля бою. Замоўкне наш кулямёт, можа сарвацца атака.

Пётр з братам перацягнулі кулямёт на вышыню, адкуль яны меткім агнём, нарэшце, знішчылі варожых кулямётчыкаў. Наша пяхота зноў кінулася ўперад.

Калі вёска была ўзята, Пётр сабраўся адправіцца ў шпіталь. У гэты час да братоў-кулямётчыкаў падышоў капітан Гардзееў. Ён падзякаваў ім за ўменне і храбрасць, праяўленыя ў гэтым баі, і сказаў, што прадстаўляе іх да ўрадавай узнагароды. На гэта Ілья адказаў:

— Мы-ж—беларусы і недарма былі ў партызанах. У нас свае рахункі з немцамі...

Пасля гэтага бою прайшло некалькі дзён. Я зноў сустрэўся з братамі Ліпай. Абодва яны служаць у тым-жа кулямётным падраздзяленні. Пётр толькі што вярнуўся са шпіталя. На грудзях братоў ордэны «Айчыннай вайны» І ступені і медалі «За отвагу».

Капітан **В. ГАРБАНЁЎ.**

2-гі Беларускі фронт.

ЧАМУ АДСТАЕ НАШ КАЛГАС

(ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ)

Просім рэдакцыю газеты «Звязда» дапамагчы нам прыцягнуць да адказнасці злачынцаў, якія развальваюць наш калгас. Пры нямецкіх акупантах за нашы мазалі яны жылі на шырокую ногу, а цяпер шкодзяць калгасу, імкнуцца знішчыць перш за ўсё конскае пагалоўе. Трэба сказаць, што часткова яны гэтага ўжо дабіліся. З лістапада па снежань 1944 года пала 10 коней і абартыравалі амаль усе конематкі.

Старшыня нашага калгаса Ф. Кейзераў чамусьці баіцца прыцягнуць іх да адказнасці. Маўчаць далей мы не можам, бо наша жыццё, наш добрабыт залежаць ад становішча калгаса. Пры такіх «справах», якія твораць злачынцы ў нашым калгасе, наш добрабыт з кожным днём пагаршаецца.

Нямецкія акупанты забралі і знішчылі ў нас лепшых коней. Тых, што асталіся, мы ў 1943 годзе, пасля вызвалення ад немцаў, абагулілі і вывелі на палявыя работы ў добрым стане. На гэтых конях мы нядрэнна правялі веснавую сяўбу. Брыгадзірам працавала дзяўчына Дуня Кейзерава, якая пацярпела ад немцаў. Яна берагла конскае пагалоўе, правільна выкарыстоўвала яго. Працаваць ёй было вельмі цяжка. Варожыя калгасу людзі дабіліся таго, што Кейзераву знялі з пасады брыгадзіра і на гэтую работу назначылі Гузава Віктара Нэсцяравіча. Хлапец гэты 1926 года нараджэння, але на вучоце ў ваенкамаце не састаіць па той прычыне, што зменшыў сабе гады. Бацька яго Гузаў Н. Е. працаваў паліцэйскім у Орле. Стаўшы брыгадзірам, В. Гузаў пачаў знясільваць і заганяць коней на асабістых патрэбах. А потым, каб пазбегнуць адказнасці, адмовіўся ад работы брыгадзіра.

Брыгадзірам стала былая партызанка Зінаіда Новікава. Яе хутка беспадстаўна знялі з работы. Тады брыгадзірам быў назначан Янкоў Міхаіл Іванавіч. У пачатку вайны ён, лёгка ранены, прыйшоў дадому разам з немцамі. Малодшы брат яго Янкоў Іван быў заядлым паліцэйскім, якога забілі партызаны. Старэйшы брат—Янкоў Нікіта быў агентам паліцыі і ўцёк з немцамі. Сам-жа Янкоў Міхаіл працаваў у немцаў пры Ліпеніцкай воласці.

За час работы Янкова Міхаіла брыгадзірам у калгасе пала 10 коней, а астатнія коні знаходзяцца ў дрэнным стане. Амаль усе конематкі абартыравалі. Значная частка коней загінула ад таго, што ён іх перагнаў. Частка коней прапала па віне Аксёна Лукашова (пры немцах быў старастам), Фёдара Ільёва (пры немцах быў намеснікам старасты). Трэба дадаць толькі тое, што ўсе гэтыя коні загінулі не на калгаснай рабоце, а на асабістай рабоце названых асоб.

Мы не можам таксама мірыцца і з такім становішчам, калі куры, якіх мы знеслі на ферму, хварэюць сухотамі, калі цяляты, здадзеныя намі па кантрактацыі на МТФ здаровымі, цяпер многія не ўстаюць. Мы не можам мірыцца і з іншымі злачынствамі, якія твораца ў нашым калгасе.

Мы просім рэдакцыю газеты «Звязда» дапамагчы нам прыцягнуць да адказнасці злачынцаў, дапамагчы нам зрабіць свой калгас перадавым, такім, якім ён быў да вайны.

М. ІЛЬЁЎ, Е. ЯНКОВА, Н. РАЖКОЎ, ТКАЧОВА, САЛОННІКАВА, СІЛІНА, ГУЗАВА і другія калгаснікі сельгасарцелі «Перадавік», Ліпеніцкага сельсовета, Буда-Кашалёўскага раёна, Гомельскай вобласці.

* * *

БУДА-КАШАЛЁВА. **(Кар. «Звязды»).** Праведзенай праверкай на месцы ўстаноўлена, што факты, прыведзеныя групай калгаснікаў у пісьме, пацвердзіліся.

Калгас «Перадавік» да вайны быў адным з лепшых калгасаў Буда-Кашалёўскага раёна. На яго палях з кожным годам павялічваліся ўраджаі, рос працадзень калгаснікаў. Калгаснікі працавалі дружна, старанна, бо ведалі, што толькі ад сумленнай працы залежыць умацаванне іх калгаса, іх добрабыт. Чым-жа растлумачыць той факт, што некалі перадавы калгас цяпер апынуўся ў ліку адстаючых? Перш за ўсё гэта тлумачыцца тым, што кіруючыя раённыя арганізацыі і, ў першую чаргу, выканком райсовета дэпутатаў працоўных і райком партыі далёка недастаткова займаюцца пытаннем арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацавання калгасаў. Калгас «Перадавік»—не адзіны адстаючы калгас у раёне.

У сваім пісьме калгаснікі ўказваюць на недапушчальныя справы, якія тварыліся ў калгасе ў мінулым годзе. Але ўрокі мінулага года не ўлічаны. Цяглавая сіла калгаса знаходзіцца і цяпер у надзвычай дрэнным стане. Коні хворыя, яны вельмі нізкай укормленасці. Галоўнай прычынай гэтага з'яўляецца тое, што тут яшчэ не ліквідавана абязлічка, тут церпяць злачынныя адносіны да конскага пагалоўя.

У калгасе вельмі нізкая працоўная дысцыпліна. Да гэтага часу не рамантуецца інвентар. Нічога не робіцца па арганізацыі брыгад і звенняў, па замацаванню за імі палявых участкаў.

Старшыня арцелі Фёдар Кейзераў нядаўна вярнуўся з фронта. Ён інвалід Айчыннай вайны. Усе яго старанні па наладжанню арцельнага жыцця астаюцца дарэмнымі. У чым-жа справа? Адзін ён не можа ачысціць калгас ад нямецкіх агентаў, а з раёна мала хто сюды заглядае. Так, напрыклад, старшыню выканкома райсовета дэпутатаў працоўных тав. Лаўрыновіча ў сельгасарцелі бачылі толькі адзін раз, у верасні мінулага года. Першы сакратар РК КП(б)Б тав. Зайцаў яшчэ ні разу не быў тут.

Палітычна-выхаваўчая работа як у гэтай арцелі, так і ў многіх другіх, знаходзіцца на нізкім узроўні. У многіх калгасах агітатары іспуюць толькі на паперы, а ў сапраўднасці ніхто з калгаснікамі не праводзіць палітычна-масавай работы. Калгаснікі не ведаюць апошніх пастаноў партыі і ўрада адносна сельскай гаспадаркі, мала знаёмы з падзеямі на франтах Айчыннай вайны. Адсутнасць палітычна-масавай работы на вёсцы прывяла да таго, што раён яшчэ да гэтага часу не выканаў плана засыпкі насенных і страхавых фондаў, не закончыў абмалоту ўраджаю мінулага года.

Справы калгаса «Перадавік» павінны служыць сур'ёзным сігналам. Кіраўнікі Буда-Кашалёўскага раёна павінны карэнным чынам перабудаваць сваю работу і ўшчыльную заняцца арганізацыйна-гаспадарчым і палітычным умацаваннем калгасаў.

В. ЛЯЎКОЎ.

КАЛГАСНЫ АГІТАТАР

Ужо добра развіднела, калі настаўнік Аляксандр Баярчук сабраўся ў школу. Ён спяшаўся. Апрача лекцый настаўнік намеціў пазнаёміць вучняў з рашэннямі Крымскай канферэнцыі кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў. Толькі ўчора позна вечарам лістаносец прынёс яму газету з гэтым гістарычным дакументам. Да позняй ночы настаўнік рыхтаваўся да гутаркі—асобна для вучняў і калгаснікаў.

На вуліцы, недалёка ад школы, настаўнік сустрэўся са звеннявой Еленай Шыляпок і старым калгаснікам Ігнатам Закружным. Прывітаўшыся, ён звярнуўся да іх:

— Сёння ўвечары збірайцеся ў канцылярыю калгаса. Вельмі цікавыя навіны ёсць у газеце. Дзед Ігнат, вы таксама прыходзьце.

— Абавязкова прыду,—адказаў стары.

Вечарам канцылярыя калгаса была поўна калгаснікаў. Усе яны загадзя ведалі, што вечарам настаўнік школы, іх калгасны агітатар, будзе праводзіць чарговую цікавую гутарку. Сярод прысутных былі і старыя калгаснікі—Міхась Казёл, Ігнат Закружны, а таксама калгасніцы—стаханаўкі —Хартына Заяц, Праскоўя Попчанка, Параска Шкірман і многія другія. Усе яны з нецярплівасцю чакалі прыходу настаўніка, хацелі хутчэй даведацца аб навінах, якія ён раскажа. Праўда, многія здагадваліся аб чым будзе ісці гутарка, бо чулі, што Крымская канферэнцыя кіраўнікоў трох дзяржаў закончыла сваю работу.

Калі агітатар падыйшоў да стала, разгарнуў газету і знаёмы калгаснікам сшытак, куды ён заносіць канспекты праведзімых гутарак, у памяшканні стала ціха. Агітатар пачаў чытаць газету з рашэннямі Крымскай канферэнцыі. Кожнае слова гэтага гістарычнага дакумента калгаснікі слухалі з вялікай увагай. І калі Аляксандр Баярчук прачытаў словы: «Нашай няўхільнай мэтай з'яўляецца знішчэнне германскага мілітарызма і нацызма і стварэнне гарантыі ў тым, што Германія ніколі больш не будзе ў стане парушыць мір усяго свету», у канцылярыі пачуліся апладысменты.

Калі агітатар скончыў гутарку, да стала падышоў стары Ігнат.

— Сабакам—сабачая смерць!—гнеўна сказаў ён.—Я думаю, што мы ўсімі сіламі дапаможам нашым воінам-вызваліцелям як найхутчэй прывесці ў выкананне гэты смяротны прысуд над фашыстамі.

Услед за дзедам Ігнатам выступалі многія калгаснікі. Усе яны гаварылі пра тое, што, каб хутчэй дасягнуць перамогі над ворагам, трэба яшчэ лепш працаваць па аднаўленню свайго калгаса, па лепшай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Калі многія калгаснікі разыйшліся па хатах, стары Ігнат падсеў да настаўніка.

— Ну, а цяпер раскажы нам, як ты таго гадзюку-эсэсаўца злавіў, што ўсіх курэй перадушыў у нашай вёсцы.

Аляксандр Баярчук—былы партызан. Ён у баях нямала знішчыў фашыстаў. У яго партызанскім жыцці было многа цікавых гісторый, аб якіх ён часта расказвае калгаснікам. Ігнату Закружнаму асабліва падабаўся той выпадак, калі Аляксандр Баярчук злавіў гітлераўскага ката, што кожны дзень прыязджаў грабіць сялян.

Позна ноччу агітатар пакінуў канцылярыю калгаса. Да дому яго праводзілі калгаснікі, сярод якіх ён карыстаецца вялікай пашанай і любоўю.

Алесь ЛЯСНЫ.

Калгас «Чырвоныя Лукі».
Васілевіцкі раён.

Алесь СТАХОВІЧ

Дзяўчына з Палесся

(Апавяданне)

У гэтую ноч не спалася дзяўчыне. Яна некалькі разоў падыходзіла да свайго ложка, бяссэнсоўна перакідвала падушкі з месца на месца, клалася ў пасцель, але праз момант зноў уставала, вобмацкам надзявала чаравікі і ў чорнай цемені спавала па хаце. Ёй хацелася пагаварыць, параіцца з блізкім чалавекам, але пасля таго, як немцы забралі яе бацьку, дзяўчына асталася адзінокай. У хаце больш нікога не было. Раіцца было не з кім. Трэба было вырашаць самой. А час ішоў. Набліжалася світанне.

На стале бялеў спісаны вялікімі, няроўнымі літарамі аркуш паперы, які ўвечары прынёс ёй нямецкі афіцэр і загадаў вывучыць напісанае напамяць. Але Марыся, пасля таго, як пакінуў яе афіцэр, нават і не дакранулася да гэтай паперкі. Яна аб ёй не хацела і думаць. Яе хвалявала другое. Марыся задуменна стаяла сярод хаты, нібы прахожы на бязлюдным скрыжаванні дарог, выбіраючы сабе далейшы напрамак. А за вуглом гнеўна шумеў, злаваўся густы вясновы вецер і сухая вішнёвая галінка сумна шкрабала па шклу.

«Куды пайсці? Што рабіць? Можа кінуць сваю хату і, пакуль яшчэ зусім не развіднелася, знікнуць у прыцемках?..»

Яна прыхінулася гарачай шчакой да потнай, халоднай шыбы і глянула на вуліцу.

Міма хаты, пазіраючы на вокны, прайшлі два немцы і, нібы на перакурку, спыніліся ля плоту.

Цяпер ужо іншых думак не магло і быць. Хавацца было позна. Аставалася адно, тое, аб чым больш за ўсё і думала Марыся ў гэтую бяссонную ноч.

Раніцай яна адчыніла шуфляду, дастала плацце, акуратна расчасала свае густыя русыя валасы, запляла іх у дзве тоўстыя, роўныя касы, перавіла шаўковай істужкай і, ускінуўшы вянком на галаву, глянула ў невялічкае люстэрка, што вісела ля ложка. Стомлены, усхваляваны твар, з сінякаватымі вяночкамі пад пламяністымі вачыма глянуў на дзяўчыну. Марыся здрыганулася ад нечаканасці і хутка адыйшла ад люстэрка. Затым яна надзела ватоўку, узяла са стала паперку, паклала яе ў кішэнь, замкнула дзверы і выйшла на двор.

Чорныя, калматыя хмары, заслаўшы сонца, нізка паўзлі над стрэхамі будынкаў. А над былой сядзібай калгаснага каваля, распасцёршы вялікія крыллі, кружыў бусел. Ён толькі што вярнуўся з цёплых краёў і зараз шукаў свайго старога, абжытага гнязда. Але дарэмны былі яго пошукі. Замест высокай, раскідзістай ліпы з шырокай бараной на суках, ён убачыў усяго толькі абгарэлы стырчак, а замест утульнай сядзібы гаспадара—чорныя галавешкі. Бусел зрабіў яшчэ некалькі кругоў, памахаў крылламі і, набіраючы вышыню, паляцеў на ўсход.

Марыся выцерла хусцінкаю вочы, кіўнула галавой, нібы назаўсёды развітаючыся з мясцінай, дзе яна пражыла свае дваццаць веснаў, і мерна пакрочыла па дарозе.

На буграх і ўзгорках з-пад снегу чарнела зрытая бомбамі зямля. Сівымі дывізнамі, прыплюснутымі да камлюгоў, ляжала нязжатае леташняе жыта, з граз нясмела выглядалі струхнелыя каласы.

Па разрыхленаму, падобнаму на ябтычны кісель, снегу невялікімі групамі ішлі сяляне ў Стараселле. Вось напрамкі з кійком у руцэ кульгае згорблены дзед Нупрэй, якога яшчэ здалёку пазнала Марыся. Яго падтрымлівае старая жанчына. А следам за імі крочыць немец і ўвесь час бурчыць, падганяе старых.

Марыся агледзелася назад. Па яе слядах, на невялікай адлегласці, ішлі два узброеныя немцы. Гэта былі тыя самыя салдаты, якіх яна бачыла ў вакно, што на світанні курылі ля плоту.

«Значыць няўпэўнены»... падумала дзяўчына і прыбавіла кроку.

Ужо было пад поўдзень, калі Марыся ўвайшла ў Стараселле.

На былой калгаснай плошчы, акаймаванай маладымі дрэўцамі, у два рады стаялі выстраеныя салдатамі сяляне. А каля маўклівых радоў шпацыравалі немцы, прыслухоўваючыся да гаворкі.

У баку ад людзей, з жалезным крыжам на мундзіры стаяў каржакаваты афіцэр, прыхінуўшыся плячыма да штакету. Заўважыўшы Марысю, ён ажывіўся і ўзмахам рукі паклікаў яе да сабе.

— Ну, Марыся, не пераблытаеш?—з нацягнутай усмешкай запытаў ён дзяўчыну.

— Не, не, пан афіцэр, я ніколі нічога не блытала.

— Не згубіла прамову?

— Не турбуйцеся, пан афіцэр, прынесла.

Яна выцягнула з кішэні пакамечаны аркуш паперы і паказала афіцэру.

— Ну, ну! Глядзі-ж мне!—сказаў ён і, павярнуўшыся тварам да старасты, загадаў—можна пачынаць.

Чалавек з доўгім, сінім рубцом на правай шчацэ падняўся на трыбуну. Усе ў ваколіцы даўно ўжо ведалі гэтага Барадаўку. У каго толькі не пабываў ён нязваным госцем у цёмныя ночы... Хоць прамоўца ён быў нікудышны, але-ж афіцэр, каб падтрымаць свайго паслугача, часам пляскаў у далоні. Калі-ж у прамоўцы пачынаў заплятацца язык, афіцэр злосна тузаў яго за крысо паліто і нервова шаптаў:

— Што ты пляцеш, дурань!

Барадаўка ўздрыгваў плячыма, схіляў галаву ў бок афіцэра, прасіў прабачэння і зноў, размахваючы рукамі, дзёр сваё хрыплае, праціТае гарэлкай горла.

Марыся, нахмурыўшы бровы, стаяла ля трыбуны. Ёй было брыдка слухаць гэтага нікчэмнага адшчапенца, які ўжо даўно страціў, а можа зусім ніколі і не меў, аблічча чалавека. Дзяўчыне хацелася сцягнуць яго з трыбуны, схапіць за горла і тут-жа на вачах усіх задушыць сваімі ўласнымі рукамі.

Нарэшце ён скончыў. Слова далі Марысе.

Светларусая дзяўчына, расхінуўшы ватоўку, смела ўзышла на трыбуну. Шчокі яе ўспыхнулі, загарэліся яркай чырванню, а вочы ажылі, заблішчэлі зялёнымі іскаркамі.

— Дарагія таварышы! — усхвалявана пачала яна.—Нас прыгналі на гэты мітынг нашыя смяротэльныя ворагі. Афіцэр загадаў мне гаварыць тое, што ён напісаў вось на гэтай паперцы. Немцы хочуць, каб я хваліла іх. Адубеюць яны, праклятыя ірады, павыпростваюцца на нашай зямлі беларускай, не пачуюць яны добрага для іх слова ад нас...

Скалыхнуліся сялянскія шарэнгі. Спачатку нясмела, а затым з нарастаючай сілай загучэлі воплескі ў паветры, пачуліся асобныя галасы і шчыльнае кальцо натоўпу акружыла трыбуну.

Нібы ў прыступе трасцы закалаціўся нямецкі афіцэр. Ён схапіўся за пісталет і было пачаў ужо цэліцца ў Марысю, але дзед Нупрэй, які вынырнуў з натоўпу, жвава падкавыляў да афіцэра і адным узмахам ляснуў яго арэхавым кіем па галаве. Афіцэр, выпусціўшы з рук рэвальвер, распластаўся на мокрай зямлі ля трыбуны.

З жывёльным жахам у вачах Барадаўка кулём зляцеў з трыбуны і, скінуўшы чорнае паліто, даў цягу за сяло.

А звонкі голас дзяўчыны гучэў з трыбуны:

— Нашы родныя браты прабіваюць дарогу да нас. Яны ідуць праз трупы гэтых паганцаў. Набліжаецца дзень нашага вызвалення...

Раптам па трыбуне, з-за вугла, адкрылі агонь два нямецкія аўтаматчыкі, якім удалося выскальзнуць з натоўпу.

На плошчы пачуліся крыкі, узнялася сумяціца.

Голас Марысі нечакана абарваўся на поўслове. Яна рэзка пахіснулася на бок і, хапаючы паветра, мякка апусцілася на парэнчу. Яе блакітная сукенка на грудзях пакрылася чырвонымі плямамі крыві, якія з кожным подыхам дзяўчыны ўсё больш распаўзаліся, рабіліся цёмнымі.

Некалькі мужчын у момант падбеглі да трыбуны. Нечыя моцныя рукі падхапілі Марысю і хутка панеслі за будынак. Да яе яшчэ даносіліся рэдкія ўсхліпы кулямёта, жаночы енк, пранізлівы крык дзіцяці і гул натоўпу, які расцякаўся па вёсцы. Але ўсё гэта здавалася ёй далёкім-далёкім, быццам па той бок ракі, што перасякала даўно знаёмыя ёй старасельскія загоны.

Чалавек, які падтрымліваў Марысю за левае плячо, раз-по-разу паўтараў:

— Марыся! Марыся!..—і клаў ёй у рот кавалачкі снегу.

Але Марыся не адзывалася.

Ужо далёка за вёскай мужчыны спыніліся ля куста, каб перавязаць раны дзяўчыне, але з-за бугра зноў пачалі пасвістваць кулі, і яны былі вымушаны спяшацца да лесу. На прылеску яны беражна паклалі Марысю на падасланыя галінкі. Танклявы хлапец, спадзяючыся выратаваць дзяўчыну, таропка скінуў з сябе пінжак, зняў белую сарочку і, разарваўшы яе напалам, пачаў перавязваць ёй раны.

Вясновы ветрык мякка прабег па збялеламу твару Марысі, пацерабіў споўзшыя на скроні залаціста-русыя пасемцы валасоў, зашавяліў яе доўгія, загнутыя расніцы, страсянуў арэшыну і, зашалясцеўшы сухім леташнім лісцем, віхрам пранёсся праз паляну.

У крупскіх лясах



Звонам піл і стукам тапароў шумяць лясы Крупскага раёна. На трактах і лясных дарогах скрыпяць палазы, на румах і пагрузачных станцыях звіняць стромкія хвоі і бомы. Да 500 лесарубаў і звыш 900 возчыкаў лесу сваёй штодзённай і напружанай работай у лясах дабіваюцца датэрміновага выканання важнага дзяржаўнага задання.

Крупскія калгаснікі ў IV квартале мінулага года датэрмінова нарыхтавалі і вывезлі на станцыі 22.000 кубаметраў будаўнічага лесу, паліва, рудстойкі. Яны маюць нядрэнны вопыт работы ў лесе і абавязаліся датэрмінова выканаць план нарыхтоўкі і вывазкі лесу і ў першым квартале 1945 года.

Заданне было вялікае, работа прадстаяла напружаная. Неабходна было нарыхтаваць 18.000 кубаметраў будаўнічага лесу і паліва, вывезці і падвезці да чыгуначных станцый і сплаўных участкаў 35 тысяч кубаметраў драўніны.

На дапамогу ў арганізацыі лесанарыхтовак былі мабілізаваны работнікі з ліку раённага партыйнага і савецкага актыву. Па ініцыятыве калгаснікаў Шэйскага сельсовета ў раёне быў аб'яўлен франтавы месячнік па выкананню плана лесанарыхтовак. У сваім звароце да калгаснікаў і калгасніц, да ўсіх лесарубаў і возчыкаў калгаснікі Шэйскага сельсовета пісалі:

«Для практычнага ажыццяўлення сваіх абавязацельстваў мы накіравалі ў леспрамгас 65 лесарубаў і 85 возчыкаў, забяспечылі іх добрымі піламі, дастатковай колькасцю прадуктаў і фуража. У кожным калгасе арганізавалі сталыя брыгады лесарубаў і возчыкаў. На ўвесь час лесавывазак за ездавымі замацавалі лепшую цяглавую сілу. Да кожнай брыгады лесарубаў і да кожнага возчыка давялі штодзённае заданне паводле графіка. Паміж возчыкамі і кожнай парай лесарубаў заключылі індывідуальныя соцдагаворы і вынікі іх выканання падводзім штодзённа пасля работы. Для заахвочвання лепшых стаханаўцаў—лесарубаў і возчыкаў стварылі ў кожным калгасе спецыяльны прэміяльны фонд грошай, хлеба і промтавараў. Да кожнай брыгады лесарубаў і возчыкаў прымацавалі чытчыкаў газет і агітатараў».

Зварот калгаснікаў быў апублікаван на старонках крупскай раённай газеты «Голас калгасніка».

Адказваючы на гэты зварот масавым выхадам на нарыхтоўку і вывазку лесу, калгаснікі Абчугскага сельсовета першымі ў раёне за 45 дзён выканалі трохмесячнае заданне і далі ў фонд Дзяржаўнага Камітэта Абароны 200 кубаметраў спецыяльнай драўніны звыш плана. Гэтаму поспеху спрыяла добрая падрыхтоўка да лесанарыхтовак у калгасах, выкананне кожным лесарубам і возчыкам загадзя выпрацаванага графіка работ.

Ажыццяўляючы цвёрды графік работ і разгортваючы спаборніцтва ў брыгадах, 17 лютага выканаў дзяржаўнае заданне па лесанарыхтоўках і Ухвальскі сельсовет. Выканаўшы план, калгасы гэтага сельсовета абавязаліся да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі даць у фонд Галоўнага Камандавання 30 процантаў драўніны звыш плана. Сваё абавязацельства калгаснікі з чэсцю выканалі.

Датэрмінова выканалі план лесанарыхтовак большасць калгасаў Шэйскага сельсовета—ініцыятара соцыялістычнага спаборніцтва ў раёне. Сельгасарцель імені Будзённага, Сакаловіцкага сельсовета, выканаўшы заданне яшчэ 6 лютага, разгарнула нарыхтоўку лесу ў лік другога квартала.

А. МАТУСЕВІЧ.

На здымку ўверсе: калгаснікі перадавога Абчугскага сельсовета, Крупскага раёна, вязуць лес да чыгуначнай станцыі.

Фото Л. Мазелева.

У БЯРЭЗІНСКІХ СПЛАЎШЧЫКАЎ

БАБРУЙСК. **(Кар. «Звязды»).** Сплаўшчыкі Бярэзінскага басейна прынялі выклік сплаўшчыкаў Латвійскай ССР аб паспяховым выкананні плана сплаву ў навігацыю 1945 года.

Адначасова яны выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва работнікаў Прыпяцкай сплаўканторы і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Агульны план сплаву ў навігацыю 1945 года, з дастаўкай лесу ў канечныя пункты, работнікі Бярэзінскага басейна абавязаліся выканаць да 28-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі на 110 процантаў, а ўсю драўніну, якая падвезена да басейна,—прыплавіць без страт у канечныя пункты не пазней 15 чэрвеня.

Вялікую ўвагу ў сваіх абавязацельствах бярэзінскія сплаўшчыкі ўдзялілі падрыхтоўчым работам: ачыстцы русла на працяжэнні 250 кіламетраў, рамонту лодак, аднаўленню плацін, нарыхтоўцы матэрыялаў для звязкі лесу і г. д. Апрача гэтага, да 1 красавіка тут павінны быць добраякасна адрамантаваны 4 буксірныя кацеры.

Абавязацельствамі прадугледжаны таксама работы па палепшанню культурна-бытавых умоў сплаўшчыкаў. Так, для бесперабойнай дастаўкі прадуктаў харчавання і падвозкі рабочых да месца сплаву тут павінны быць сабраны і поўнасцю абсталяваны 2 аўтамашыны. На веснавы перыяд для сплаўшчыкаў будуць арганізаваны 5 катлапунктаў і хлебапякарня, пабудаваны 3 часовыя баракі, чырвоныя куткі. На ўсіх участках будуць арганізаваны дошкі паказчыкаў работы.

Сплаўшчыкі Бярэзінскага басейна вытворчую праграму мінулага года перавыканалі. У шырока разгарнуўшымся соцыялістычным спаборніцтве на навігацыйных работах выраслі выдатныя стаханаўцы. Так, план сплаву 1944 года брыгада Нікіфара Акуневіча выканала на 196 процантаў, Сімхі Фельдмана—на 193, Паўла Луканскага—на 184, Марыі Вішнеўскай—на 175 проц. і г. д.

ВЫТВОРЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ

З дня вызвалення рэспублікі ад нямецкіх акупантаў па сістэме спажывецкай кааперацыі арганізаваны і працуюць 130 цэхаў розных вытворчасцей і 20 райпромкамбінатаў. Імі за 1944 год выпушчана прадукцыі на 1.600.000 рублёў.

У гэтым годзе спажывецкая кааперацыя значна павялічвае аб'ём сваіх работ па пашырэнню існуючых прамысловых прадпрыемстваў і арганізацыі новых. Выпуск прадукцыі будзе даведзен да 26 мільёнаў. рублёў. Сюды ўваходзіць выпуск розных швейных вырабаў на тры з палавінай мільёна рублёў, ганчарнай пасуды на 800 тысяч рублёў, бандарнай і лесашчэпнай прадукцыі на 4 мільёны рублёў, абознай—на 700 тысяч рублёў і г. д.

Будуць адкрыты новыя цэхі па выпуску дзіцячых цацак і школьных прыналежнасцей.

Шэфства над шпіталем

БРЭСТ, 2 сакавіка. (БЕЛТА). Студэнты Брэсцкага чыгуначнага тэхнікума ўзялі шэфства над шпіталем. Днямі студэнты разам з работнікамі шпіталя арганізавалі для выздараўліваючых воінаў вечар мастацкай самадзейнасці.

Большасць комсамольцаў-шэфаў сталі донарамі. Студэнты Тамара Волкава, Ольга Пракудзіна і сакратар комсамольскай арганізацыі Нікалай Голуб першымі здалі сваю кроў для выратавання жыцця воінаў. Лік студэнтаў-донараў расце з кожным днём.

У дзень гадавіны Чырвонай Арміі шэфы ўручылі падарункі раненым байцам і афіцэрам.

АБЛАСНЫ АГЛЯД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

БАРАНАВІЧЫ, 2 сакавіка. (БЕЛТА). Закончыўся абласны агляд мастацкай самадзейнасці. Агляд прайшоў як вялікая культурная падзея ў жыцці обласці. У ім удзельнічалі лепшыя калектывы самадзейнасці, а таксама індывідуальныя выканаўцы 12 раёнаў.

Асабліва цёпла быў прынят на аглядзе хор вёскі Вялікае Падлессе. Ён выдатна выканаў рад старадаўніх беларускіх песень. Надзвычай цікавым было таксама выступленне аркестра сям'і Андрушкевіч з Усялюбскага сельсовета, Навагрудскага раёна. Журы агляду дало таксама высокую ацэнку танцавальнаму калектыву слонімскага Дома культуры.

Усебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва

за узорную работу МТС

БРЫГАДА ЖАЎНЕРЧЫКА АБАВЯЗАЛАСЯ ВЫПРАЦАВАЦЬ 1.500 ГЕКТАРАЎ НА ТРАКТАР

ПУХАВІЧЫ. **(Па тэлефону).** Калектыў Пухавіцкай МТС з выключнай радасцю сустрэў вестку аб уручэнні нашай рэспубліцы пераходнага Чырвонага сцяга Дзяржаўнага Камітэта Абароны за выкананне студзеньскага плана рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын. У МТС цяпер, як і ва ўсёй рэспубліцы, паспяхова закончан рамонт усіх трактараў.

Гэтымі днямі ў МТС адбыўся сход трактарыстаў, рабочых, курсантаў і служачых па абмеркаванню звароту Прапойскай МТС аб арганізацыі ўсебеларускага соцыялістычнага спаборніцтва за ўзорную работу МТС у гэтым годзе. Пасля чыткі звароту першым выступае брыгадзір другой трактарнай брыгады тав. Жаўнерчык.

— Мая брыгада, — гаворыць ён,—падтрымлівае пачын калектыва Прапойскай МТС. Мы бярэм на сябе абавязацельства выпрацаваць у гэтым годзе на кожны 15-сільны трактар 1.500 гектараў, зэканоміць гаручага 15 процантаў і змазачных—8 процантаў. Апрача таго, мы абавязваемся на 100 процантаў захаваць адпрацаванае масла.

Брыгадзір трэцяй брыгады тав. Верамейчык абавязваецца выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар 1.200 гектараў. Высокія абавязацельствы бяруць многія трактарысты.

Уключаючыся ва ўсебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва, калектыў Пухавіцкай МТС абавязаўся выпрацаваць у гэтым годзе не менш 1.000 гектараў на 15-сільны трактар і зэканоміць 10 процантаў гаручага і 5 процантаў змазачных. Метадамі народнай будоўлі калектыў МТС абавязаўся зрабіць сваю станцыю ўзорным, культурным прадпрыемствам.

Усебакова падрыхтуемся да сяўбы

ЗАСЛАЎЛЬ. **(Па тэлефону).** 2 сакавіка адбыўся сход трактарыстаў, рабочых, курсантаў і служачых Заслаўскай МТС па абмеркаванню звароту калектыва Прапойскай МТС. З выключнай увагай прысутныя праслухалі прапановы прапойскіх трактарыстаў аб неабходнасці ў гэтым годзе рэзка палепшыць работу машынна-трактарных станцый рэспублікі, значна павялічыць выпрацоўку на кожны трактар.

— Каб паспяхова выканаць задачы, якія стаяць перад намі, — гаворыць брыгадзір трактарнай брыгады тав. Тарасік,—мы перш за ўсё павінны добра, усебакова падрыхтавацца да веснавой сяўбы. Не гледзячы на тое, што мая брыгада, як і ўся наша МТС, выканала план рамонту трактараў, я абавязваюся дадаткова не пазней 1 красавіка адпавіць яшчэ адзін калёсны трактар. Адказваючы на заклік прапойскіх трактарыстаў, мая брыгада абавязваецца выпрацаваць у гэтым годзе на кожны 15-сільны трактар 800 гектараў.

У цэлым-жа калектыў Заслаўскай МТС абавязаўся выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар не менш 500 гектараў, зэканоміць гаручага 10 процантаў і змазачных—5 процантаў. Кладучы ў аснову ўсёй сваёй работы пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год, калектыў МТС абавязаўся ўсямерна змагацца за павышэнне ўраджайнасці калгасных палёў.

Будзем працаваць без перабояў

КРУПКІ. (БЕЛТА). Рабочыя і служачыя Крупскай МТС, дзе шырока прыменен метад народнай будоўлі, сабраліся для абмеркавання звароту калектыва Прапойскай МТС, Магілеўскай обласці, да ўсіх трактарыстаў рэспублікі аб уключэнні ва ўсебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва за ўзорную работу МТС у 1945 годзе.

Трактарыст тав. Самсонаў узяў абавязацельства на 15-сільны трактар выпрацаваць не менш 800 гектараў, эканоміць гаручае і змазачныя, не мець паломак і прастояў у рабоце.

Трактарыст тав. Барадач, які выступіў на сходзе, сказаў:

— Крупская МТС у хуткім часе стане культурным цэнтрам на вёсцы. Ужо цяпер закладзен фундамент некалькіх дзесяткаў новых будынкаў. Ёсць майстэрня, лазня і іншыя пабудовы. Трактарныя брыгады забяспечаны заправачнай тарай і неабходнымі інструментамі. Усё гэта дасць магчымасць нам працаваць без перабояў і дабіцца лепшых паказчыкаў у рабоце.

Калектыў аднагалосна рашыў уключыцца ва ўсебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва работнікаў МТС.

Вынікі работы двух райпромкамбінатаў

ГРОДНА. У сістэме Скідзельскага райпромкамбіната працуюць 8 млыноў, прадзільна-вязальны цэх, сталярная, слясарная, ганчарная, дзве бандарныя майстэрні, тры кавальскія арцелі і майстэрня па вырабу каткоў. Вытворчасць іх базіруецца на мясцовай сыравіне.

Дырэктар райпромкамбіната тав. Кавалёў і інжынер тав. Лапікаў добра арганізавалі работу сваіх прадпрыемстваў. Майстэрні і арцелі раёна аказваюць вялікую дапамогу сялянам у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Толькі адна кавальская арцель мястэчка Луно на 15 лютага адрамантавала больш 70 плугоў і барон.

Зусім інакш абстаяць справы ў Лідскім райпромкамбінаце. Магчымасці для развіцця мясцовай прамысловасці і выпуску тавараў шырокага спажывання тут значна большыя, чым у Скідзелі. Аднак у Лідскім раёне іх не скарыстоўваюць. У райпромкамбінаце ёсць толькі воўначоска, сталярная і слясарная майстэрні. Тут з поспехам можна арганізаваць работу валёначнага і прадзільна-вязальнага цэхаў і іншых прадпрыемстваў, у якіх адчуваецца вялікая патрэба. У раёне таксама трэба арганізаваць 2—3 шавецкія арцелі па пашыўцы новага і рамонту старога абутку, як гэта зроблена ў Скідзелі. Для гэтага трэба толькі праявіць ініцыятыву і жаданне.

Але дырэктар Лідскага райпромкамбіната тав. Лызлоў бяздзейнічае, не займаецца арганізацыяй прадпрыемстваў. якія павінны задавальняць патрэбы працоўных ў прадметах шырокага спажывання.

Г. ЯСЮЦІН.

Апавяданні пра помсту

(«Астап»—зборнік апавяданняў Міхася Лынькова).

На старонках зборніка Міхась Лынькоў уваскрашае падзеі нядаўніх дзён, якія яшчэ доўга будуць прыцягваць увагу паэтаў і пісьменнікаў і натхняць іх на стварэнне высокамастацкіх твораў. Многія апавяданні новага зборніка Міхася Лынькова знаёмы чытачу па перыядычнаму друку, але, сабраныя ў адной кнізе, яны ствараюць уражанне цэласнага твора, галоўная тэма якога—святая помста савецкіх людзей ненавіснаму ворагу.

Міхась Лынькоў вельмі пераканаўча ў мастацкіх вобразах паказвае, як вайна напоўніла людзей лютай нянавісцю да нямецкай навалачы. У кожнага з лынькоўскіх герояў свой уласны рахунак да ворага і кожны з іх лічыць сваім свяшчэнным абавязкам помсціць яму ўсімі даступнымі сродкамі.

Маленькі Мікола, у свет дзіцячых лятуценняў і забаў якога ўварваліся немцы, афяруючы жыццём, помсціць за забітых матку і сястру, узрывае штабную машыну з нямецкімі афіцэрамі. Старая жанчына знішчае нямецкага ефрэйтара, помсцячы за забітых дзяцей. Ірына з аднайменнага апавядання падрывае поезд з узбраеннем і сама гіне ў імя свабоды сваёй Радзімы.

Праз усе апавяданні зборніка праходзіць тэма духоўнага благародства савецкіх людзей. Чытаючы апавяданне «Кавалак хлеба», нельга не захапляцца крыштальна чыстай і непадкупнай натурай старыка, якога «новы парадак» штурхнуў на шлях жабрацтва і нястач. Нямецкі обер-лейтэнант, задумаўшы разыграць злы жарт над старым, кінуў яму пад ногі кавалак белага хлеба, намазаны маслам. З вялікім майстэрствам перадае аўтар псіхалагічны стан старыка, пачуцці і гонар якога былі зняважаны чужынцам. Якім нікчэмным стварэннем выглядае нямецкі «заваёўнік» перад велічнай у сваім духоўным харастве згорбленай фігурай беларускага селяніна. У апісанні гэтай суровай прастаты старога, яго стрыманасці і гаспадарчай руплівасці Міхась Лынькоў літаральна чаруе чытача сваім майстэрствам:

«Стары беражна падняў з зямлі кавалак хлеба, асцярожна дзьмухнуў з яго пылінкі, пясок, зняў прыстаўшыя саломінкі і таксама сур'ёзна, як рабіў ён усё на свеце, аддаў хлеб сабаку».

Потым ён сказаў: «Выбачайце, пан афіцэр, калі я, магчыма, не так зразумеў вас... Але, бачыце, я павінен сказаць вам, што ў нашым краі і па ўсёй нашай рускай зямлі так даюць хлеб звычайна толькі сабакам».

Кожны герой апавяданняў Міхася Лынькова жыве сваім жыццём, мае сваю біяграфію. Добра запамінаецца вобраз дзеда Аўсея («Дзед Аўсей і Палашка»). Вабіць таксама манументальны вобраз народнага героя сусанінскага характару дзеда Астапа («Астап»).

Амаль усе апавяданні зборніка «Астап» маюць востры і захапляючы сюжэт. Міхась Лынькоў умее знайсці неабходную ізюмінку, без якой не існуе сапраўднага мастацкага апавядання. Характэрнай рысай лынькоўскіх сюжэтаў з'яўляецца тое, што яны разгортваюцца спачатку паступова, а затым набываюць шпаркую імклівасць. Выключэннем у гэтым сэнсе з'яўляецца апавяданне «Насустрач шчасцю», у якім традыцыйная пабудова сюжэта адразу агаляе замысел аўтара і робіць яго тэндэнцыйным.

Пейзажныя замалёўкі ў апавяданнях Лынькова арыгінальна ўплятаюцца ў тканіну твора. Яны дапамагаюць лепш адчуць і зразумець псіхалагічны стан герояў. Улагоджваючы тон экспазіцыі ў апавяданні «Васількі» нагадвае зацішша перад навальніцай і добра адцяняе бурнае развіццё апісваемых падзей. У апавяданні «Кавалак хлеба» пісьменнік расказвае, як груша, пакалечаная ў часе баёў і ледзь не засохшая, расквітнела раптам за адну ноч белым кіпеннем кветак. Гэты малюнак набывае вялікі сімвалічны сэнс пра нятленную сілу жыцця, якое хацелі загасіць драпежныя звяры—немцы. Па празрыстасці апісання, па багаццю фарбаў і лаканічнасці лынькоўскія пейзажы нагадваюць вершы ў прозе. Вось канцоўка апавядання «Астап»:

«Дзеда пахавалі на ўзбярэжжы, пад вялікай разгалінастай хвояй. Адсюль відаць шырокі разліў ракі, бязмежныя лугі і палі на тым беразе. Неасяжныя бары сцерагуць вечны спакой чалавека. А калі вышэй узнімаецца сонца на небе, расцвітаюць навокал лясавыя краскі і першыя з іх—дзівосны сон баравы. Калі адцвітае яна—пяшчотна сіняя сцюдзёная краска—тады жыццё адкрывае ўсе вокны, усе дзверы ў лясах, зелянеюць лугі, выкідваецца клейкі ліст на бярозе, першыя травінкі, былінкі прашываюцца праз леташні ліст, і ў зялёнай цвецені вясны пачынае запяваць сваю спрадвечную песню дзівосная птаха-зязюля».

Дзіцячыя вобразы зборніка «Астап» заслугоўваюць асаблівай увагі. Міхась Лынькоў заслужана карыстаецца славай дзіцячых апавяданняў. Яго кнігі для дзяцей «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышоў» і «Міколка—паравоз»—маюць вялікі поспех у маленькіх чытачоў. Вельмі праніклёна намаляваны вобразы дзяцей—Міколкі («Васількі»), правобразам якога з'яўляецца піонер са Жлобіншчыны Саша Цішкевіч, і вобраз Вулькі («Пацалунак»).

Хацелася-б сустрэцца з героямі зборніка «Астап» на старонках вялікага твора, аповесці ці рамана,—які, будзем спадзявацца, напіша Міхась Лынькоў.

Г. ШКРАБА.

З ЗЯМЛЯНАК — У НОВЫЯ ДАМЫ

АСВЕЯ, 3 сакавіка. (БЕЛТА). Пасля гітлераўскага гаспадарання ў Асвейскім раёне амаль на асталося дамоў. Жыхарам прышлося туліцца ў зямлянках. За гэтую зіму працоўныя раёна правялі значныя будаўнічыя работы. Да 200 сем'яў з зямлянак перасяліліся ўжо ў новыя дамы. Зараз заканчваецца будаўніцтва яшчэ 65 дамоў калгаснікаў.

Нанава адбудоўваецца раённы цэнтр Пабудаваны памяшканні для райкома партыі, райвыканкома і раду іншых раённых арганізацый.

НА ПАБУДОВУ ТАНКАВАЙ КАЛОНЫ

БРЭСТ, 1 сакавіка. (БЕЛТА). Імкнучыся дапамагчы сваёй вызваліцельніцы — пабеданоснай Чырвонай Арміі чым найхутчэй разбіць ворага, працоўныя вобласці сабралі на пабудову танкавай калоны «Савецкая Беларусь» адзін мільён 775 тысяч рублёў. Толькі па Брэсту і Брэсцкаму раёну ўнесена больш 500 тысяч рублёў.

ГОМЕЛЬ, 1 сакавіка. (БЕЛТА). Два мільёны 100 тысяч рублёў сабралі работнікі Беларускай чыгункі на будаўніцтва танкавай калоны. Баявыя машыны перададзены войскам генерал-палкоўніка Багданава.

МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

23 лютага савецкі народ святкаваў 27-ю гадавіну свайго любімага дзецішча—гераічнай Чырвонай Арміі. У загадзе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, прысвечаным гэтай слаўнай даце, гаворыцца, што Чырвоная Армія «выратавала народы Савецкага Саюза ад нямецка-фашысцкага рабства, адстаяла свабоду і незалежнасць нашай Радзімы і дапамагла народам Еўропы скінуць нямецкае ярмо». Свята Чырвонай Арміі набыло таму міжнароднае значэнне.

Ва ўсіх частках свету, ад сталіц вялікіх саюзных дзяржаў да аддаленых куткоў Аўстраліі, усюды адзначаўся дзень нараджэння Чырвонай Арміі. Кіраўнікі дзяржаў, грамадскія дзеячы і шырокія народныя масы ўсіх краін свету, якія змагаюцца супроць фашызма, выказвалі свае захапленне і ўдзячнасць гераічнай Чырвонай Арміі.

Свабодалюбівыя народы святкавалі гадавіну існавання Чырвонай Арміі ў абстаноўцы жорсткіх баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Шведскі генерал Тэрнгрэн, каментыруючы абстаноўку на савецка-германскім фронце, гаворыць аб «смяртэльнай небяспецы», якая стварылася для немцаў. Фашысцкія заправілы не ў сілах утаіць свайго жаху і збянтэжанасці перад магутным савецкім наступленнем. Газета Гімлера «Дас Шварцэ кор», гаворачы аб неабходнасці «шырокіх контрмер», прызнае, што зараз гітлераўскае камандаванне не можа ажыццявіць іх. «Гэтыя мерапрыемствы, — сумна канстатыруе фашысцкі лісток,— патрабуюць часу, а з дапамогай паўмер мы не дасягнем намечаных мэт». Крах германскай ваеннай машыны набліжаецца з кожным часам. Яшчэ лямантуюць у смяртэльным жаху Гітлер і яго надручныя. Яны яшчэ прабуюць пагражаць. Але ім не ўдасца змяніць прыгавор гісторыі. Як заўважае англійскі радыё-аглядальнік Алан Бел, іх лямант «аддае гнілой бульбай», а іх пагрозы «падобны міне, з якой выцягнут узрывацель».

Наступленне Чырвонай Арміі супадае з актыўнасцю нашых саюзнікаў на захадзе, якая ўзмацнілася. Саюзныя арміі 23 лютага пачалі наступленне супроць германскіх войск, якія апіраюцца на ўмацаванні праславутай «лініі Зігфрыда». Гэтаму наступленню садзейнічае тая акалічнасць, што немцы перакінулі значную частку сваіх войск на Усходні фронт: з 90 дывізій, якія былі ў іх на захадзе, асталося, як паведамляе замежны друк, усяго толькі 28—30 дывізій.

У ходзе наступальных аперацый саюзныя войскі занялі рад населеных пунктаў, у тым ліку гарады Лініх, Юліх, Дзюрэн, Мюнхенгладбах. Саюзныя арміі знаходзяцца ў 11 кілометрах ад Кельна, а па другім напрамку ўступілі ў Трыр. Англа-амерыканская авіяцыя наносіць сакрушальныя ўдары па германскіх тылах. За апошнія дні Берлін падвергся ўзмоцненым бамбардыроўкам. Саюзная авіяцыя бамбіла Дортмунд, Нюрнберг, Мюнхен і іншыя гарады Германіі.

Вярхоўны галоўнакамандуючы экспедыцыйнымі сіламі саюзнікаў генерал Эйзенхаўэр заявіў на прэс-канферэнцыі, што калі ўмовы надвор'я астануцца такімі, як цяпер, то «наступленне, сведкамі якога мы з'яўляемся, будзе азначаць пачатак разгрому германскіх войск на захадзе ад Рэйна».

* * *

Важнейшай палітычнай падзеяй гэтых дзён з'явілася паседжанне англійскай палаты абшчын, якая абмеркавала рашэнні Крымскай канферэнцыі. У сваім выступленні, прысвечаным вынікам гэтай канферэнцыі, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Чэрчыль падкрэсліў растучае адзінства паміж саюзнікамі. «Саюзнікі, — заявіў Чэрчыль,—прышлі да Крымскай канферэнцыі больш цесна аб'яднанымі, чым калі-небудзь раней, як у ваенных, так і ў палітычных адносінах». Гэтае адзінства, як ён неаднаразова адзначаў у сваёй прамове, мае велізарнае значэнне для дасягнення перамогі над ворагам і забяспечання міру і бяспекі. «Будучы адзінымі, — указаў Чэрчыль, — мы валодаем непераадольнай сілай весці свет да працвітання, свабоды і шчасця». Ён спыніўся на радзе пытанняў, вырашаных Крымскай канферэнцыяй, адводзячы, у прыватнасці, многа ўвагі праблемам пасляваеннага ўпарадкавання свету. Чэрчыль адзначыў, што на канферэнцыі было дасягнута пагадненне па пытаннях, па якіх саюзнікам не ўдалося раней дагаварыцца на канферэнцыі ў Думбартон-Оксе.

Асаблівую ўвагу прэм'ер удзяліў рашэнню польскай праблемы. Чэрчыль даў адпор спробам выкарыстаць «польскае пытанне» ў якасці зброі для ўнясення расколу ў лагер саюзнікаў. «Лёс чалавецтва, — сказаў ён, — быў-бы змрочным, у выпадку ўзнікнення якога-небудзь жахлівага расколу паміж заходнімі дэмакратыямі і рускім народам». Прапанова ўстанавіць савецка-польскую граніцу па «лініі Керзона» не павінна выклікаць пярэчанняў. «Я асабіста, — адзначыў Чэрчыль,—лічу, што рускае патрабаванне справядлівае і правільнае».

Закрануўшы рад іншых пытанняў, якія абмяркоўваліся на канферэнцыі, Чэрчыль прапанаваў палаце прыняць рэзалюцыю, якая-б ухваляла дэкларацыю Крымскай канферэнцыі. Гэтая рэзалюцыя была прынята, а папраўкі да яе, унесеныя і накіраваныя, галоўным чынам, супроць рашэнняў аб Польшчы, адвергнуты пераважнай большасцю галасоў. У канцы дэбатаў палата абшчын аднагалосна выказала вотум давер'я ўраду.

* * *

Прэм'ер-міністр румынскага ўрада Радэску, выражаючы волю рэакцыйных элементаў з так званых «гістарычных» партый, за апошні час адкрыта стаў на пазіцыі абароны прафашысцкіх элементаў у краіне.

Як вядома, прадстаўнікі Нацыянальна-дэмакратычнага фронта настайвалі на правядзенні ў жыццё дэмакратычных рэформ і арганізацыі чысткі дзяржаўнага апарата Румыніі ад засеўшых у ім фашыстаў. Радэску ўсяляк перашкаджаў ажыццяўленню гэтых патрабаванняў. Ён адверг патрабаванне аб правядзенні зямельнай рэформы, заявіўшы, што «цяпер не час для яе правядзення». Адлюстроўваючы імкненні буйных памешчыкаў не дапусціць раздзелу іх зямель, румынскі прэм'ер-міністр пагражаў, што землеўладальнікі быццам бы «перастануць апрацоўваць зямлю». Апіраючыся на прафашысцка настроеную частку афіцэрства, Радэску рыхтаваў анты-дэмакратычны пераварот, разлічваючы ўстанавіць дыктатуру рэакцыйнай ваеншчыны. Заахвочваемая ім рэакцыя паўсямесна перайшла ў наступленне. 20 лютага фашысцкія малойчыкі напалі на заводзе «Малакса» на рабочых і выстралам у жывот ранілі старшыню румынскай канфедэрацыі працы Георгія Апостала. Нападу падвергся таксама рэдактар прагрэсіўнай газеты «Скынтэйя». У радзе гарадоў былі падрыхтаваны паліцэйскія і фашысцкія атрады для барацьбы супроць Нацыянальна-дэмакратычнага фронта. У ноч на 24 лютага рэакцыянеры атакавалі і абстралялі ў Бухарэсце будынак цэнтральнага камітэта соцыял-дэмакратычнай партыі Румыніі.

Нацыянальна-дэмакратычны фронт у той-жа дзень заклікаў народныя масы на мірную дэманстрацыю пратэсту супроць узмацняючайся рэакцыі. Дэманстранты патрабавалі арышту фашысцкіх лідэраў. Удзельнікі дэманстрацыі ўсюды былі сустрэты ружэйным і кулямётным агнём. У Бухарэсце, Крайове, Брашове, Каракале і іншых гарадах адбыліся крывавыя сутычкі. Замест таго, каб пакараць віноўнікаў расстрэлу народных мас, Радэску адкрыта адобрыў тых, хто страляў у дэманстрантаў.

Совет Нацыянальна-дэмакратычнага фронта 25 лютага апублікаваў камюніке, у якім патрабаваў адстаўкі Радэску і заклікаў да барацьбы за знішчэнне фашызма і ўсіх яго саўдзельнікаў і апекуноў. Гэтае патрабаванне было падтрымана ўсім народам. Радэску, пра якога англійскі часопіс «Эканаміст» пісаў, што ён стаў «цэнтрам правых тэндэнцый», вымушан быў пайсці ў адстаўку.

Паводле апошніх паведамленняў, кароль даручыў фарміраванне новага ўрада прадстаўніку Нацыянальна-дэмакратычнага фронта намесніку старшыні совета міністраў П. Гроза.

Л. ЯКАЎЛЕЎ.

ФАБРЫКА ЛЯКАРСТВЕНЫХ ПРЭПАРАТАЎ

У Навукова-даследчым інстытуце мікрабіялогіі і эпідэміялогіі.

У Мінску, па вуліцы імені Мяснікова, многа год знаходзіўся Навукова-даследчы інстытут мікрабіялогіі і эпідэміялогіі. У інстытуце вялася сканцэнтраваная і напружаная праца над навуковымі праблемамі, праводзіліся даследванні, выраблялiся лякарственыя прэпараты супроць тыфа, дызентэрыі, коры, воспы і іншых інфекцыйных захворванняў.

Барацьбой з інфекцыйнымі захворваннямі, вывучэннем і абясшкоджаннем мікробаў—узбуджальнікаў гэтых захворванняў — вось чым быў заняты калектыў інстытута.

Вайна абарвала работу інстытута. Нямецка-фашысцкія орды разбурылі, разграмілі гэтую важную навуковую ўстанову.

...У жніўні—верасні 1944 года можна было назіраць такі малюнак: тыя-ж самыя людзі, што працавалі тут да вайны,—кандыдаты навук, урачы, навуковыя работнікі, лабаранты, прыбіральшчыцы ачышчалі памяшканне інстытута ад смецця, падносілі цэглу, мылі падлогу, бялілі сцены.

Два месяцы калектыў інстытута штодзённа працаваў над прывядзеннем ў парадак сваёй любімай навуковай установы. Цяпер інстытут выглядае па-ранейшаму, як да вайны.

Работа ў інстытуце ў поўным разгары. Функцыяніруюць аддзелы: вакцынны, сываратачны, воспенны, кор'евы, біяхімічны, аддзел кішэчных інфекцый, антыгенны, кантрольная лабараторыя і іншыя.

Вось вакцынны аддзел. Тут цікавы працэс работы. Супрацоўнікі бяруць у бутэльку мікробную культуру, затым па кроплях пераносяць яе ў другую з жывіцельным асяроддзем, ставяць яе ў вялікія тэрмастатныя пакоі з тэмпературай у 37 градусаў (тэмпература чалавечага цела). Праз некаторы час вырастае велізарная колькасць мікробаў, якіх, пасля ўмярцвення, перапрацоўваюць у вакцыну, прыгодную для папярэджання ад захворвання тыфам.

Вось воспенны аддзел. Стаіць паголенае цялё, цела якога ўсё ў драпінах, у якія ўводзяць мікробаў — узбуджальнікаў воспы. Праз некалькі дзён уся скура цяляці пакрываецца коркай узбуджальніка воспы. Цялё забіваюць, здымаюць скуру, з якой саскабліваюць корку. Пасля перапрацоўкі корка ператвараецца ў вакцыну, якая папярэджвае захворванне воспай.

Тут многа цікавага ў кожным аддзеле. За кароткі тэрмін інстытут дабіўся выпуску розных лякарственых прэпаратаў: чатырох відаў дыягностыкумаў для вызначэння дыягназа тыфа, кор'евай сыараткі, вакцыны супроць шаленства, сыараткі супроць дыфтэрыі, вакцыны супроць воспы. Апрача таго, рыхтуецца вакцына супроць тыфа, дызентэрыі і рад іншых.

Складаная і шматбаковая работа інстытута. Яго калектыў працуе самаааддана, дапамагаючы сваёй Радзіме і фронту.

Арк. ГУР.

Закончылася спартакіяда Беларуска-Літоўскай ваеннай акругі

На працягу чатырох дзён у сталіцы рэспублікі праходзіла спартакіяда Беларуска-Літоўскай Ваеннай Акругі. Больш 600 байцоў, сержантаў і афіцэраў аспрэчвалі першынства па лыжах, каньках, у пераадоленні штурмавой паласы, па штыкавому бою, па практыкаваннях на спартыўных снарадах, бруссях, кані. У выніку спаборніцтва пераможцам 10-кілометравай дыстанцыі выйшаў чэмпіён БССР па лыжах лейтэнант Краснасельскі, які паказаў час — 38 мінут 25 секунд. Старшы сержант Гогалеў атрымаў перамогу на 20 кіламетраў з вынікам 1 гадзіна 31 мінута 55 секунд. Сярод жанчын-лыжніц першынства заваявала жонка афіцэра Аля Люпен, якая прайшла трохкілометроўку за 14 мінут 45 секунд. (Усесаюзны рэкорд—13 мінут 45 секунд). Дачка афіцэра Тацяна Калінова атрымала перамогу на дыстанцыю 10 кіламетраў. Яна прайшла гэтую адлегласць за 1 гадзіну 02 мінуты 23 секунды. За пяць гадзін 33 мінуты і 30 секунд у дрэннае надвор'е — бездарожжа—лейтэнант Малчанаў прайшоў на лыжах 50-кіламетравы шлях.

У спаборніцтве канькабежцаў пераможцамі выйшлі на розныя дыстанцыі старшына Сінякоў, сержант Кірычоў, чырвонаармеец Антонаў, старшы лейтэнант Макараў і Аля Люпен.

Чатыры хакейныя каманды аспрэчвалі першынства паміж сабой. Перамогу атрымалі хакеісты, дзе капітанам каманды старшы лейтэнант Елфімаў.

Самым цікавым на спартакіядзе было многабор'е ўзводаў. Байцы са зброяй і поўнай баявой выкладкай прайшлі на лыжах 30 кіламетраў, стралялі нахаду, кідалі гранаты, перамагалі прыродныя перашкоды, спаборнічалі на турніку, у штыкавым баі. Тут поўную перамогу заваяваў узвод малодшага лейтэнанта Нікіціна.

На заключным вечары ўдзельнікаў спартакіяды загадам Камандуючага Беларуска-Літоўскай Ваеннай Акругі пераможцы спаборніцтва былі ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі.

Пераможцы ўсебеларускай спартакіяды паедуць на ўсесаюзныя лыжныя спаборніцтвы абараняць спартыўную чэсць Беларусі.

(БЕЛТА).

ЗІМОВАЯ СЕСІЯ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Закончылася зімовая сесія завочнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На сесіі займалася больш 250 студэнтаў-завочнікаў фізіка-матэматычнага, гістарычнага, геаграфічнага і філалагічнага факультэтаў. На працягу 8 дзён на кожным факультэце прачытана больш 60 гадзін лекцый па розных прадметах.

У рабоце сесіі прынялі ўдзел віднейшыя навуковыя работнікі універсітэта. Доктар гістарычных навук прафесар А. А. Савіч чытаў лекцыі па гісторыі народаў СССР, прафесар М. Н. Смірноў — курс агульнай фізічнай геаграфіі, заслужаны дзеяч навук БССР прафесар Л. І. Нікалаў—па геаграфіі раслін.

(БЕЛТА).

У ВІЦЕБСКІМ ВЕТЭРЫНАРНЫМ ІНСТЫТУЦЕ АДНАВІЛІСЯ ЗАНЯТКІ

Днямі аднавіліся заняткі на ўсіх курсах Віцебскага ветэрынарнага інстытута. Навучальны будынак, разбураны нямецкімі бандытамі, адноўлен. Нанова створаны навуковыя кабінеты, бібліятэка. Інстытут мае вялікую падсобную гаспадарку. Сярод студэнтаў многа партызан.

По Советскому Союзу

Па Совецкаму Саюзу

Тры з палавінай года Трэцьякоўская галерэя была закрыта. Усе творы мастацтва, якія захоўваліся ў ёй, з пачатку вайны былі эвакуіраваны. Зараз фонды галерэі зноў знаходзяцца ў Маскве. У 52 залах Трэцьякоўскай галерэі ідзе напружаная праца. Мастакі-рэстаўратары і навуковыя супрацоўнікі прыводзяць карціны ў годнае для эксплаатацыі становішча. Галерэя рыхтуецца да адкрыцця.

На здымку: кіраўнік рэстаўрацыйных мастацкіх работ мастак **Е. В. Кудраўцаў** ля карціны мастака Перова «Паляўнічыя на прывале».

Фотахроніка ТАСС.

ПАТРЫЯТЫЧНЫ ЎКЛАД ЮНЫХ НАТУРАЛІСТАЎ

Усесаюзная акадэмія сельска-гаспадарчых навук імені В. І. Леніна і Наркамасветы РСФСР падвялі вынікі другога конкурса на лепшага зборшчыка верхавінак клубняў бульбы. За мінулыя два гады ў конкурсе ўдзельнічала звыш 1.100.000 школьнікаў і піянераў РСФСР. Яны сабралі за гэты час больш 41.000 цэнтнераў верхавінак клубняў бульбы, дзесяткі тысяч тон мясцовых угнаенняў. Гэта дало магчымасць дадаткова пасадзіць бульбу на плошчы ў 10.000 гектараў. Краіна і Чырвоная Армія атрымалі звыш плана мільёны пудоў бульбы.

Пераможцамі конкурса прызнаны школьнікі і піянеры Свярдлоўскай вобласці. Другое месца занялі школьнікі і піянеры Омскай вобласці і Чувашскай АССР, трэцяе— школьнікі і піянеры Чыцінскай і Іркуцкай абласцей.

(ТАСС).

50 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ ЭКАНОМІІ

Закончыўся грамадскі агляд вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў у тэкстыльнай прамысловасці. На 244 прадпрыемствах налічваецца звыш 6.100 рацыяналізатараў і вынаходцаў. З паступіўшых ад іх на працягу мінулага года 7.513 прапаноў ужо ўкаранёна ў вытворчасць 4.770, якія даюць эканомію звыш 50 мільёнаў рублёў у год.

(ТАСС).

НАРОДНАЯ БУДОЎЛЯ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ НА УРАЛЕ

На малых рэках Урала працуе 85 гідрастанцый, з іх 38 пабудаваны ў часе вайны. Гідраэлектрастанцыі даюць святло каля 10.000 калгасным дварам, забяспечваюць энергіяй дзесяткі прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці.

Зараз метадамі народнай будоўлі ўзводзяцца яшчэ 11 гідрастанцый. Усе будаўнічыя матэрыялы калгаснікі адшукваюць на месцы. Вытворчасць невялікіх турбін асвоена сельскімі майстэрнямі.

(ТАСС).

«НЕПАКАРОНЫЯ» НА ЛІТОЎСКАЙ СЦЭНЕ

«Непакароныя» («Сям'я Тараса») Б. Гарбатава ў інсцэніроўцы М. Мержанава пераклаў на літоўскую мову пісьменнік А. Мішкініс. У Каўнаскім дзяржаўным тэатры драмы гэтую п'есу ставіць рэжысёр В. Дзейнеке. Ідуць рэпетыцыі. У спектаклі заняты лепшыя сілы тэатра.

НОВЫ НАФТАВЫ ФАНТАН

САРАТАЎ. Гэтымі днямі пры выпрабаванні скважыны 4 у раёне Сокалавай гары, паблізу Саратава, забіў нафтавы фантан вышынёй у 30 метраў.

Як паведамляюць, нафта Сакаловагорскага месцанараджэння—высокай якасці.

ТКАНІНА ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

З новага года тэкстыльная прамысловасць Грузіі значна расшырыла выпуск так званых грамадзянскіх тканін. Тбіліская камвольна-суконная фабрыка «Совецкая Грузія» прыступіла да вырабу драпу для мужчынскіх і жаночых паліто, а таксама клетчатых шэрсцяных тканін. У параўнанні з мінулым годам значна расшыраецца выпуск касцюмных тканін.

За два апошнія месяцы шоўкаткацкія фабрыкі Грузіі поўнасцю аднавілі выпуск тканіны даваеннага асартыменту. Ужо выпрабляецца больш 40 гатункаў шаўковых тканін.

МІКРАСКОПЫ З МАЛЯВАЛЬНЫМІ АПАРАТАМІ

У Ленінградзе, на заводзе, дзе дырэктарам тав. Прымачук, аднавілася вытворчасць малявальных апаратаў да мікраскопаў, якія прымяняюцца ў эксперыментальнай медыцыне.

Апрача таго, зноў наладжан выпуск прыбораў для дэталёвага вывучэння пад мікраскопам будовы непразрыстых і малапразрыстых цел.

(ТАСС).

УСЕСАЮЗНЫЯ ЛЫЖНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ

Закончыліся ўсесаюзныя лыжныя спаборніцтвы калгаснай моладзі, якія адбываліся на працягу некалькіх дзён пад Масквой. У спаборніцтвах прымала ўдзел каля 150 лыжнікаў Маскоўскай, Свярдлоўскай, Горкаўскай і іншых абласцей, а таксама Грузінскай, Армянскай і Карэла-Фінскай ССР.

Першае месца па спартыўных выніках на ўсесаюзных спаборніцтвах занялі лыжнікі калгасаў Свярдлоўскай вобласці, другое месца — лыжнікі калгасаў Маскоўскай вобласці.

Сумесны заклік комуністычнай і соцыялістычнай партый Францыі

ПАРЫЖ, 3 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Франс Прэс перадае, што газеты «Попюле» і «Юманітэ» апублікавалі сумесны заклік ад імені цэнтральнага камітэта комуністычнай партыі і кіруючага камітэта соцыялістычнай партыі. У гэтым дакуменце абедзве партыі заяўляюць аб сваёй згодзе весці неадкладна смелыя і стваральныя сумесныя дзеянні. «Гэтым заклікам,—гаворыцца ў дакуменце,—абедзве партыі хочуць засведчыць сваю вернасць праграме, аднагалосна прынятай 15 сакавіка 1944 года Нацыянальным советам супраціўлення, які патрэбаваў правядзення пасля вызвалення наступных мерапрыемстваў: стварэння сапраўднай эканамічнай і соцыяльнай дэмакратыі, што цягне за сабой адхіленне эканамічнай і фінансавай плутакратыі ад кіраўніцтва эканомікай; звароту народу буйных манапалізіраваных сродкаў вытворчасці, крыніц энергіі, выкапных багаццяў, страхавых таварыстваў і буйных банкаў, а таксама канфіскацыі маёмасці здраднікаў і спекулянтаў і ўсёй маёмасці ворага, уключаючы маёмасць, якая нажыта пасля перамір'я, і ператварэння ўсёй гэтай маёмасці ў неадчужаемы нацыянальны здабытак».

Загад маршала Тіто аб перайменаванні Народна-Вызваленчай арміі і флота Югаславіі

БЕЛГРАД, 3 сакавіка (ТАСС). Даверany па справах нацыянальнай абароны Югаславіі Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Югаславіі Іосіп Броз-Тіто выдаў загад аб перайменаванні Народна-Вызваленчай арміі Югаславіі і рэарганізацыі Вярхоўнага штаба арміі.

«Народжаная ў вызваленчай барацьбе нашых народаў,—гаворыцца ў загадзе,—Народна - Вызваленчая армія, выконваючы справу вызвалення нашай радзімы, стала сапраўды адзінай узброенай сілай дэмакратычнай федэратыўнай Югаславіі. Наша армія трымаецца на брацтве і адзінстве нашых народаў і прадстаўляе магутны фактар далейшага ўмацавання гэтага брацтва. Дзякуючы сваёй спеласці і ваеннаму майстэрству наша армія ажыццяўляе ролю сучаснай рэгулярнай арміі.

З прычыны гэтага загадваю:

1. Народна-Вызваленчую армію з гэтага часу называць Югаслаўскай арміяй.
2. Ваенна-марскі флот Народна-Вызваленчай арміі называць Югаслаўскім ваенна-марскім флотам.
3. Вярхоўны штаб Народна-Вызваленчай арміі і партызанскіх атрадаў Югаславіі рэарганізаваць у Генеральны штаб, як непасрэдны орган Даверанага па справах нацыянальнай абароны для ўсіх узброеных сіл краіны».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 3 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што саюзныя войскі занялі Рурмонд і Венло (Галандыя). На поўначы ад Мюнхен-Гладбаха (Германія) саюзнікі ўзялі Дзюлькен і Фірзен. Саюзнікі ўступілі ў Крэфельд і занялі Нейс. На захадзе ад Кельна часці саюзнікаў прасунуліся да Бельбурга і Бухгольца.

Буйныя злучэнні цяжкіх бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні знішчальнікаў раніцай і днём 2 сакавіка падверглі бамбардыроўцы камунікацыі і іншыя аб'екты ў Кельне.

На ўсходзе ад Дзюрэна войскі саюзнікаў, прасунуўшыся на 4 кілометры, уступілі ў Гімніх. Ачышчаны Вісерсхейм і Эрп. Танкавыя часці саюзнікаў уступілі ў Бор і Фрысхейм. Саюзнікі ачысцілі Геймбах і прасунуліся на поўдзень да ўсхода ад ракі Рэр. На поўдні і паўднёвым усходзе ад Прума заняты Вінрынген і Зеферн.

Танкавыя і пяхотныя часці саюзнікаў занялі Трыр. Войскі саюзнікаў, якія прасоўваюцца з паўночнага захада, знаходзяцца ў 4 кілометрах ад гэтага горада і занялі Керш. На паўднёвым захадзе ад Трыра саюзнікі занялі Конц-Картхаус (ля зліцця рэк Саар і Мозель).

За 1 сакавіка войскі саюзнікаў узялі на заходнім фронце 7.053 палонных.

Авіяцыя саюзнікаў дзейнічала супроць камунікацый і транспарта праціўніка на захадзе і ўсходзе ад Рэйна. Лёгкія бамбардыроўшчыкі зрабілі ў ноч на 3 сакавіка налёты на аб'екты ў Берліне і Каселе.

ЛОНДАН, 3 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ў Італіі дзеянні часцей саюзнікаў абмяжоўваліся дзеяннямі патрулёў і артылерыйскай перастрэлкай.

Авіяцыя саюзнікаў рабіла налёты на камунікацыі праціўніка ў раёне Лінца (Аўстрыя) і Брэшыі (Паўночная Італія).

Войскі саюзнікаў дасягнулі Рэйна паблізу Дзюсельдорфа

Заява генерала Эйзенхауэра аб ходзе наступлення

ЛОНДАН, 3 сакавіка. (ТАСС). Як перадае карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, які знаходзіцца пры штабе вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў, вярхоўны галоўнакамандуючы войскамі саюзнікаў генерал Эйзенхауэр заявіў вечарам 2 сакавіка:

«Тыдзень таму назад 9-я і 1-я арміі ўключыліся ў наступленне, прадпрынятае 1-й канадскай арміяй на поўначы 8-га лютага. Поспех гэтага наступлення надзвычай здавальняючы, а страты, на шчасце, невялікія. 9-я армія дасягнула Рэйна паблізу Дзюсельдорфа, а войскі генерал-лейтэнанта Сімпсона захапілі па меншай меры 17,5 тысяч палонных».

НАЛЁТ 1900 АМЕРЫКАНСКІХ САМАЛЁТАЎ НА ГЕРМАНІЮ

ЛОНДАН, 3 сакавіка. (ТАСС). Як перадае карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, які знаходзіцца пры штабе амерыканскіх ваенна-паветраных сіл у Францыі, звыш 1.200 амерыканскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі 2 сакавіка налёт на заводы сінтэтычнага гаручага ў Магдэбургу і Болене (на поўдні ад Лейпцыга), нафтаачышчальныя заводы ў Розіцэ (на поўдні ад Болена), на буйны танкавы завод Крупа ў Магдэбургу і на чыгуначнае дэпо ў Хемніцэ і Дрэздэне. Бамбардыроўшчыкі ішлі ў суправаджэнні больш 700 знішчальнікаў.

НАЛЁТ 2000 АМЕРЫКАНСКІХ САМАЛЁТАЎ НА ГЕРМАНІЮ

ЛОНДАН, 3 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, 3 сакавіка каля 2000 амерыканскіх самалётаў зрабілі масіраваны налёт на розныя аб'екты ў Германіі. Бамбардыроўцы былі падвергнуты галоўным чынам прамысловыя прадпрыемствы і заводы сінтэтычнага гаручага.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЛАНДСКАГА АГЕНЦТВА АБ ІНТЭРНІРАВАННІ ЗДРАДНІКАЎ

ЛОНДАН, 3 сакавіка. (ТАСС). Галандскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ў цяперашні час у вызваленай частцы Галандыі інтэрніравана 12 тысяч галандцаў, якія абвінавачваюцца ў супрацоўніцтве з акупантамі і ў прыналежнасці да галандскай нацысцкай партыі.

Адказны рэдактар

В. САМУЦІН.

Сёння ў тэатрах і кіно:

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА
ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
імені Янкі КУПАЛЫ
«ПОЗНЯЕ КАХАННЕ»
Пачатак у 19 гадзін.

Кінотэатр «Першы»
«ІВАН ГРОЗНЫ»

Кінотэатр «Беларусь»
«У СТАРЫМ ЧЫКАГО»

Дзіцячы кінотэатр «Радзіма»
Для дзяцей
„ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ“
Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16 і 18 гадзін.
Для дарослых
«У ШЭСЦЬ ГАДЗІН ВЕЧАРА ПАСЛЯ ВАЙНЫ»
Пачатак сеансаў у 20 і 22 гадзіны.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА
ЛЕНІНА ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
ў памяшканні Дома Чырвонай Арміі
Ранішні спектакль
«АЛЕСЯ»
Пачатак у 12 гадзін.

Мінская абласная дырэкцыя радыётрансляцыйнай сеткі
абʻяўляе набор вучняў
НА ЧАТЫРОХМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ЛІНЕЙНАМАНТАЖНЫХ МАНЦЕРАЎ ДЛЯ РАБОТЫ Ў гор. МІНСКУ.

Вучні прымаюцца ва ўзросце ад 14 год.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: г. Мінск, вул. Совецкая, 40, Радыёвузел, штодзённа з 9 да 18 гадзін.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Першы Беларускі Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр імені Янкі Купалы
АБʻЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ у драматычную студыю
ПРЫ ТЭАТРЫ З ДВУХГАДОВЫМ КУРСАМ НАВУЧАННЯ

Заявы на імя дырэкцыі прымаюцца сакратаром тэатра да 15 сакавіка ва ўсе дні (апрача агульнавыхадных), з 12 да 16 гадзін.

ДА ЗАЯВЫ НЕАБХОДНА ПРЫКЛАСЦІ

пасведчанні: аб нараджэнні, аб адукацыі, ад лячэбнай установы аб тым, што паступаючы не мае захворванняў, якія перашкаджаюць рабоце на сцэне; тры фотакарткі з уласнаручным подпісам на іх.

У студыю прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме 9 класаў сярэдняй школы, ва ўзросце ад 17 да 30 год.

Студэнты атрымліваюць стыпендыю, забяспечваюцца сталовай і ўсімі відамі забеспячэння па існуючых законапалажэннях.

Інтэрнат не прадастаўляецца.

Падаўшыя заявы з'яўляюцца на прыёмныя іспыты толькі па спецыяльнаму выкліку дырэкцыі тэатра.

ДА ІСПЫТАЎ НЕАБХОДНА ПАДРЫХТАВАЦЬ НАПАМЯЦЬ ВЕРШ, БАЙКУ І НЕВЯЛІКАЕ АПАВЯДАННЕ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Мінскі абласны аддзел народнай асветы
абʻяўляе дадатковы прыём
на 6-месячныя педагагічныя курсы
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЫ

На курсы прымаюцца грамадзяне, якія маюць сярэднюю адукацыю.
Прыём заяў да 15 сакавіка.
Курсы працуюць у гарадах: Барысаве, Чэрвені і Уздзе.
Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй і кватэрай.
Згодна пастановы СНК БССР № 148 ад 16 лютага 1945 г. асобы, залічаныя на шасцімесячныя педкурсы, вызваляюцца ад работы.
АДРАСЫ ДЛЯ ПАДАЧЫ ЗАЯЎ: гор. Барысаў, дырэктару педвучылішча; Чэрвень, райана; Узда, райана.
Пры яўцы на курсы мець з сабой пашпарт.

МІНСКІ АБЛАНА.

Гродненская школа сляпых дзяцей
ПРАВОДЗІЦЬ ПРЫЁМ ВУЧНЯЎ

У школу прымаюцца сляпыя дзеці ва ўзросце ад 7 да 14 год.
Усе вучні знаходзяцца на поўным дзяржаўным утрыманні.
Навучанне ў аб'ёме 7 класаў сярэдняй школы.
ГРАМАДЗЯНЕ, ЯКІЯ МАЮЦЬ СЛЯПЫХ ДЗЯЦЕЙ, ПАВІННЫ ПАДАЦЬ ЗАЯВУ НА ІМЯ ДЫРЭКТАРА ШКОЛЫ з прыкладаннем даведкі аб страце зроку і метрычнага пасведчання.
ЗАЯВЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСУ: г. Гродна, вул. Ожэшковай, 15, школа сляпых.

ДЫРЭКЦЫЯ.

2-й КЛІНІЧНАЙ БОЛЬНІЦЫ
горада Мінска
патрабуюцца
на сталую работу:
намеснік галоўнага бухгалтара, рэнтгена-лабаранткі, медыцынскія сёстры, фармацэўты, агенты па забеспячэнню, шоферы, конюхі-возчыкі, грузчыкі, санітаркі, дворнікі і рабочыя па двару.
З ПРАПАНОВАМІ ЗВЯРТАЦЦА Ў КАНЦЫЛЯРЫЮ БОЛЬНІЦЫ ПА АДРАСУ: вул. Горкага, 2, з 9 да 17 гадзін.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

Металаапрацоўчай арцелі № 3
«ЧЫРВОНЫ ІНВАЛІД»
ПАТРАБУЮЦЦА:
кавалі, малатабойцы, слесары, токары, электраманцёры, рахункавод-касір, возчык, вучні па апрацоўцы метала.
Кваліфікаваным рабочым прадастаўляецца кватэра.
ЗВЯРТАЦЦА: гор. Мінск, вул. Варашылава, № 8.

Акадэмія Навук Беларускай ССР
АБʻЯЎЛЯЕ НАБОР
У КАНДЫДАЦКУЮ АСПІРАНТУРУ
ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

Беларуская літаратура, беларуская мова, беларускае мастацтва, гісторыя Беларусі і Усеагульная эканоміка прамысловасці і сельскай гаспадаркі, батаніка, фізіялогія раслін, сельская гаспадарка (раслінаводства, жывёлагадоўля, пладаводства і гародневодства, аграхімія, селекцыя і генетыка, абарона раслін, ветэрынарыя і зоагігіена, механізацыя сельскай гаспадаркі). балотазнаўства, лесаводства, геалогія (стратыграфія, мікрапалеанталогія, петраграфія асадачных парод, гідрагеалогія, геафізіка, геахімія), медыцына, хімія (калоідная хімія, фізічная хімія, каталіз, лесахімія, біяхімія), механізацыя торфаздабычы, тэхналогія торфаздабычы, механічная перапрацоўка торфу, хімічная тэхналогія торфу (торфакоксаванне і газіфікацыя).

АСОБЫ, ЯКІЯ ЖАДАЮЦЬ ПАСТУПІЦЬ У АСПІРАНТУРУ, ПАДАЮЦЬ ЗАЯВЫ НА ІМЯ ПРЭЗІДЫУМА АКАДЭМІІ НАВУК БССР З УКАЗАННЕМ ВЫБІРАЕМАЙ НАВУКОВАЙ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ.

Да заявы прыкладаюцца дакументы:
а) аб сканчэнні вышэйшай навучальнай установы;
б) аўтабіяграфія;
в) характарыстыка па месцу работы;
г) даведка аб адносінах да воінскай павіннасці (для ваеннаабавязаных);
д) дзве фотакарткі.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падвяргаюцца іспытам па наступных дысцыплінах:
а) Асновы Марксізма-Ленінізма;
б) па спецыяльнай дысцыпліне адпаведна выбранай спецыяльнасці;
в) па адной замежнай мове.

Аспіранты забяспечваюцца стыпендыяй у размеры 600 рублёў у месяц і інтэрнатам.

ТЭРМІН ПАДАЧЫ ЗАЯЎ ДА 15 КРАСАВІКА 1945 Г.

Дакументы накіроўваць па адрасу: г. Мінск, вул. Пушкіна, 56. Акадэмія Навук Беларускай ССР, Прэзідыум.

ПРЭЗІДЫУМ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР.

РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ
„ЗВЯЗДА“
ПАТРАБУЮЦЦА
на сталую работу:
машыністкі, бібліятэкары, швейцары.
ЗВЯРТАЦЦА: вул. Пушкіна, 55, 3 паверх, пакой 14.

Мінскаму горпромкамбінату
ПАТРАБУЮЦЦА
галоўны бухгалтар, галоўны інжынер, інжынер, тэхнік, краўцы, шаўцы для работы ў цэху і на-даму, майстры па рамонту гадзіннікаў, слесары, кавалі, жэсцянікі, сталяры, цырульнікі, кур'ер.
ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: гор. Мінск. вул. Карла Маркса, 18, пакой 29.

АТ28146 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149. Адказнага сакратара—150.